
ЯКУБ КОЛАС

ВОДГУЛЬЛЕ.

БЕЛАРУСКАЕ КООПЕРАЦЫЙНА-ВЫДАВЕЦКАЕ
ТАВАРЫСТВА «АДР[illegible]
МЕНСК, 192[illegible]



ЯКУБ КОЛАС.

ВОДГУЛЬЛЕ.

БЕЛАРУСКАЕ КООПЭРАЦЫЙНА-ВЫДАВЕЦКАЕ
ТАВАРЫСТВА „АДРАДЖЭНЬНЕ“.
МЕНСК, 1922.

ВОДГУЛЬЛЕ.

ВОДГУЛЬЛЕ.

Ці коска зазвоніць ў лугох раніцою,
Ці песьню дзяўча запяе,
Ці конік ў дарозе праскочыць трусцою,
Ці вецер ў палёх зазлуе,

Ці гром гучнабежны пракоціцца ў хмарах,
Ці грукне над лесам пярун,—
Ўсё водгук знаходзіць ў бязьмежных абшарах,
Ўсё іх дакранаецца струн.

А ты, калі гора каго напаткае,
Ці жальба пачуецца, плач,
Або запануе дзе крыўда ліхая,—
На ўсё адгукніся, адзнач!

А радасьць пачуеш, надзеі ўзаўюцца,
Каб добрыя весткі падаць,
Няхай тагды струны твае засьмяюцца
І песьняю шчасьця гучаць!

20/XI 1921 г.

ПЕСЬНІ ВЯСНЫ.

Ў полі песьні, шум і гоман.
Ну-ж, і выдаўся дзянёк!
Сьнег на дзірках, лёд надломан,
І сьпявае ручаёк:

— Гэй, сябры! гэй, ручаёчкі!
Дружна разам пабягом!
Вёскам, людзям ўсім, браточкі,
Песьню волі запяём!

Ой, вы, людзі! паглядзеце,
Колькі мы нясём вады!
Бо яднаньне—сіла ў сьвеце,
А хто дужшы грамады?

Мы дарогі ў полі знаем,
Не заблудзіцца вада.
Знаньне—сіла! мы гукаем:
Гэй, за намі, грамада!

Мы імчым ўсё далей воды,
Затапілі мы брады.
Дружнасьць—першы крок свабоды,
Згоднасьць—сіла грамады.

19/I 1909 г.

НА ЛУЗЕ.

Добра ў лузе ў час палудны,
Лёгка тут ўздыхнуць!
Хмаркі белыя марудна
За лясы плывуць:


Ветрык краскі чуць калыша,
Чараты шуршаць;
Луг зялёны жыцьцем дыша,
Конікі трашчаць;

Ў лозах шчэбет ня сьціхае,
Шум стаіць і сьвіст;

Ў яркім бляску спачывае
На ракіце ліст;

Сьпевам дружным, ціхім звонам
Поўніцца ўвесь луг,
І дрыжыць над ім, зялёным,
Жыватворчы дух.

15/v 1910 г.



ВЕСНАВАЯ НОЧ.

На зямлю сырую
Ціха ночка пала,
Бляскам-дрыгаценьнем
Зорка замігала.

Адзінокі месяц
Выплывае з хмары,
На зямлю, на неба
Сходзяць яго чары.

З цёмнай высі-багны
Ўжо глядзяць стажары,
Пояс дыямэнтны
Ткуць нябёс абшары.

Лёгкімі шаўкамі
Хмаркі разгарнуліся,
І скрозь іх шчасьліва
Зоркі усьміхнуліся...

Ох, на што ты, ночка,
Так прыгожа-міла?
Колькі ў сэрцы думак
Ты мне абудзіла!

Ой, на што пра волю
Голас твой сьпявае,
Калі маё сэрца
Волечкі ня мае?

Ой, ня кліч ты, ночка,
На прастор і волю,
Бо заплача сэрца
І душа ад болю!

Ночка-чараўніца!
Як ты ціха, міла!
Як ты многа думак
Ў сэрцы абудзіла!

7/vi 1910 г.

РАНІЦА ВЯСНОЮ.

Ціха ў полі, ціха ў лесе,
А ні шэпне вецярок,
Толькі дзесь у паднябесьсі
Льецца звонкі галасок.

Як бы срэбраны званочак,
Роніць ўніз за трэлем трэль,
Аж заслухаўся гаёчак,
Не парушыцца і ель.

На усходзе бляск агністы
Літым золатам дрыжыць;
Слуп высокі, прамяністы
Роўным полымем гарыць.

Тонкіх хмарак валаконцы
Сталі хораша ў радок,
Як бы ўюць яны для сонца
З тых валоканцаў вянок.

√ Ціха ў полі, ціха ў лесе
Чуць балбоча ручаёк,
А высока ў паднябесьсі
Льецца звонкі галасок.

7/I 1910 г.

ВЕСНАВЫЯ ХМАРКІ.

Сінім стэпам-даліною
Ходзяць хмаркі веснавыя,
Сакавітыя, густыя,
Чарадою-грамадою.

Ой, вы, хмаркі, неба дзеці!
Як вы сэрцу майму мілы!
Носіць вецер лёгкакрылы
Вас, любыя, па ўсім сьвеце.

Люба мне, як думкай Божай
Ціха зьвісшы над палямі,
Вы пракоціцесь часамі
Гукам-грукатам прыгожым;

Як маланка узаўецца,
Блісьне стужкай агнявістай,
І як песьняй галасістай
Вам зямелька адгукнецца.

Ліне дожджык, даль закрые
Белай сеткай, срэбратканай,
Цёплы дожджык і жаданы
Ўсё аджывіць, ўсё абмые.

А, зачуўшы голас грому,
Селянін з сахой на ніве
Усьміхнецца вам шчасьліва,
Стаўшы важна, нярухома;

Бо ваш гром для вёскі сына —
Лепша музыка на сьвеце...
Ой, вы, хмаркі, сонца дзеці,
Не пакрыўдзьце селяніна!

13/IV 1911 г.

МАЁЙ ВЯСЬНЕ.

Каб я волю меў,
Я сказаў бы: «Стой,
Дні вясны маёй,
Сьветлай, маладой!
Не ўцякайце вы
Ў тую даль вякоў,
Дзе пахована
Многа вас, дзянькоў,
І адкуль назад
Вам няма дарог!»
Я б стрымаў вясну,
Каб я толькі мог!
Ды бягуць дзянькі
І вясна мая!
Не вярну я іх,
Ня стрымаю я!

26/VI 1910 г.

ХМАРКІ

Сьветлыя хмаркі—дзеткі прастору,
Ціха па небе плывуць.
Ім незнаёмы сьлёзы і гора,
Смутак і жаль іх ня рвуць.

Ціха і згодна ідуць, небажаткі,—
Ўсюды ім сьцежкі ляжаць!
Божыя зоркі, быццам дзяўчаткі,
Скрозь іх валокны глядзяць.

Золатам сонца іх аблівае,
Срэбны у ноч іх калёр
З хмарак кароны неба сплятае—
Летняга ранку убёр.

Сьветлыя хмаркі, рунь залатая,
Дум небясоў чарада!
Вам незнаёма нялоля людзкая,
Беднага жыцьця нуда!

Стэп неаглядны, шыр нялюдзіма,
Вольнае царства вятроў,—
Там вашы сьцежкі, там і радзіма,
Дзеткі блакітных стапоў!

√Станьце-ж, хмурынкі, над рубяжамі
Родных палеткаў, шнуроў!
Ў сэрца людзкое кіньце з дажджамі
Думкі іх верных сыноў!

√

ПЕРШЫ ГРОМ.

Голасам Бога, ціха і важна
Гром пракаціўся ўгары.
Луг адазваўся грому працяжна,
Лес адгукнуўся стары;


Гай страсянуўся, дрыгнула поле,
Ўзгоркі той гук панясьлі.
Ў гэтым раскаце чуецца воля,
Чуецца радасьць зямлі.

Ў грукаце гэтым многа ёсьць сілы,
Чуецца моц ў ім, прастор.
Першыя громы! сэрцу вы мілы,
Любы мне сьмех ваш між гор!

Міл майму сэрцу гоман далёкі,
Водгук вясёлы і шум.
Гром-ты магутны, гром адзінокі!
Колькі ўскатурхаў ты дум!

Моцна мяне ты клічаш на волю,
Цяжка бяз волі мне тут!
Кланяйся, громе, роднаму полю,
Родны вітай ты мой кут!

26/v 1910 г.



* * *

Эх, як я-б хацеў
Па палёх прайцісь
І упіцца іх
Пахам, росамі!
Паглядзець, зірнуць,
Як жыта растуць,
Як калосікі
Наліваюцца.
Я хацеў бы знаць,
Як аплаціцца
Праца трудная
Рук мазолістых,
Як багаты рост
Ярыны ў палёх,
І мужык-ральнік
Повен дум якіх?
Ці ён смуціцца,
Пазіраючы,
Што труды яго
Так марнуюцца:
Ці ён цешыцца,
У полі ходзячы
Па мяжах, жытох
У сьвяты дзянёк,
І пад шум хлябоў
Ў сэрцы моліцца,
Каб дазволіў Бог
Ураджай сабраць.
І каб бура-град
З навальніцаю
Не пашкодзіла
Працы-радасьці?
Толькі-ж мне няма
Сьветлай волечкі,
І з турмы ніяк
Мне ня вырвацца!

23/VI 1910 г.

ЖУРБА ПАЛЁЎ.

Уплывалі хмары-горы
Белымі клубкамі,
Як бы крыгі ледзяныя
З меднымі краямі.

Ападала іх заслона
Ў беспарадку кучай,
Як бы Сам Бог дзьмухануў іх
Сілай вусн магучай.

І, пакорны Яго волі,
Уцякалі хмары.
Так прад ўсходам сонца нікнуць
Ночы страхі, чары.

І, шырока разгарнулась
Неба сінь-лазура,
Ды прырода пазірала
Хмурна і панура.

Быццам думкай невясёлай,
Наміткай туману
Засьцілаліся луг і поле,
Лес, гаі, курганы—

І глядзелі засмучона,
Як зьнікалі хмары,
І як з імі прападалі
Іх надзеі-мары;

Бо ім смага дакучала,
Сонца іх зьнішчала,
І бясплодна даждживая
Хмара уплывала.

Пазіралі, гаравалі
Нівы, сенажаці...
Так гаруе, плача сэрца
Па сваёй утраце.

14/v 1910 г.

√ СУШ.

Выйдзі ў поле, глянь, паслухай:
Ці-ж ня ўгледзіш сум жывы?
Ці ня ўчуеш жальбу нівак,
Тугу красак і травы?

Ці ня ўловіш сэрцам чуткім
Сьпеў гаротны ручаёў?
Ці ня ўнікнеш ў шум сірочы
Ярыны, грачо́к, жытоў?

Толькі-ж неба няумольна—
Што яму да тэй зямлі,
Дзе пад сіняю смугою
Далі немыя ляглі?

Таюць хмаркі, як сьняжынкі,
Разганяюць іх вятры,
І тужліва пазіраюць
На палі гаспадары.

21/VI 1913 г.

√ НА ЛУЗЕ.

Ветрык паўднёвы у лузе квяцістым
Калыша траву-сенажаць.
Сіваваронкі над дубам жарлістым
Лётаюць, звонка крычаць.

Бусел клякоча ў гнязьдзе над хваінай,
Што калісь расплляжыў пярун.
Даль неаглядная, стэп божы сіні
Змоўклі, як жалаба струн.

Божа зьвілася у лозах зялёных,
Як срэбра жывое, рака.
Ня бачна, як летась, тут, у яе ўлоньнях,
Ні плытніка, ні рыбака...

Ветрык ціхутка над лугам гуляе,
Той ветрык на сонцы дрыжыць,

Травы цалуе і краскі ласкае,
 Бог ведае, што шапаціць.

Хоць і убраны луг ў аксаміты,
 У ткань залатую шаўкоў,
Толькі-ж над лугам жалоба разьліта,
 Як ціхая скарга бяз слоў.

Здаецца, пытаюць мурог і мятліца,
 Імяла, ўся сенажаць:
„Дзе вы, сяляне? Ўжо час касавіцы,
 А вас ўсё няма, ня відаць?"

17/v 1915 г.

ХМАРКА.

Па небе хмарка залатая
На сівер з поўдзеня плыла
І ўздых палёў, жаданьні гаю
Ў сабе хмурыначка нясла.

А сонца горача сушыла,
І сохлі нівы на палёх,
Даўно зямля дажджу прасіла,
Але яе не слухаў Бог.

І ўсё заціхла, ўсё чакала
Дажджу ад хмаркі паўднявой.
Хістацца краска перастала,
Прыпаўшы к долу галавой.

Глядзеў і лес, і луг з травою,
І ўсе расьліны на зямлі:
Вось, хмарка чыстаю сьлязою
Спадзе на зьніклыя палі.

І ў неба дойдзе плач з туманам,
Што сінім дымам ціха зьвіс
Над цёмным лесам і курганам,
І ліне дожджыкам наніз.

Плыве хмурынка ў Божым полі,
Як бы на моры астравок:
Яна-ж ня чуе крыку болі —
Яна схавалась за лясок.

19/VI 1910 г.

НОЧ ПРАД НАВАЛЬНІЦАЙ.

Стаў чырван месяц круглаліцы,
І зоркі боязна дрыжаць;
А там, на поўдзені, зарніцы
Трывожна ўюцца і гарацъ.

За стужкай стужка агнявая
Без перастанку ў цьму ляціць
І ночы цемень разганяе,
Паветра ціха баразьдзіць.

Ноч так прыгожа, так спакойна,
І нават ветрык ня дыхне!
Ўсё поўна чараў, ўсё прыстойна
Ў яе бяздоннай глыбіне.

І змоўк дзянны трывожны голас,
Спакой і сон над ўсім ляжыць;
На ніве чула дрэмле колас,
І на галінцы пташка сьпіць...

Люблю я ночкі час той дзіўны:
Як Божы сьвет, абняты сном,
Пабудзіць голас пераліўны —
Далёкіх хмар магутны гром,

Як ён працяжна заракоча
Гняўлівым голасам ўгары,
І шыба ў вокнах забразгоча,
І гоман пойдзе па бары;

А хмара грозна націскае,
Маланка неба баразьдзіць,
А ночка сьпіць, а ноч ня знае,
Што зараз бура зашуміць.

17/VI 1910 г.

ПЕРАД БУРАЙ.

Сінь і глыб бяз ко́нца-края...
Ціш і згодачка сьвятая
Неба, землю абнялі.

Сонца зранку жарам пыша,
Ветрык лісьце чуць калыша,
Вее чуць паўзьверх зямлі.

Лес і поле з збажыною,
Апавітыя смугою,
Задуменныя стаяць.

І сярод цішы трывожнай
Над зямелькаю набожнай
Сталі хмаркі вынікаць;

Ды так ціха, так пужліва,
Як бы зданкі або дзіва
Невядома скуль ўстае.

Шырыць сонца клуб іх белы
І маланак-громаў стрэлы
Ім на страх зямлі куе.

А зямля як бы замлела,
Нават дуб стары нясьмела
Зрэдка лісьцем павядзе.

Змоўклі ўсе вакруг абшары,
Бо замысьлілі штось хмары...
Ой, знаць, бура загудзе!

25/VII 1916 г.

ПОСЬЛЕ НАВАЛЬНІЦЫ.

Навальніцы няма, навальніца сашла,
Хмары далей паціснулі ў сьвет,
І страхлівая цьма, дажджаная імгла
Разам з ёю пашлі ў адзін сьлед.

Хоць грыміць яшчэ гром і зямельку трасе,
Хоць маланка жахліва гарыць;
Над раўком-капяжом ў саламянай страсе,
Як сьляза, яшчэ кропля дрыжыць;

Але глухне раскат, і маланка радзей
Палыхае ў гняўлівых клубкох...
Заспакойся-ж, мой брат, і глядзі весялей,
Бо сьмяецца ўжо сонца-ў палёх!

1921 г.

МУХА.

Ночка. Ў хаце ўсе паснулі.
Ціха зорачкі мігнулі,
Ў вокны месячык глядзіць.
А пад стольлю ў павуціне
Б'ецца муха-сіраціна
І так жаласна пішчыць...

Гэты жаль на душу сходзіць
І аб леце думкі родзіць—
Шкода лета і цяпла.
Ночка бледна і маркотна...
А ёй ўторыць ўсё гаротна
Звон мушынага крыла.

10/х 1916 г.

ВОСЕНЬ У ГАЮ.

Гай заціх, бы зачарован,
Гук і сьпеў яго пахован,
Гай штось марыць і маўчыць.

Як душа ў часы зьмярканьня,
Толькі песняй пахаваньня
Вецер ў лісьцю зашуміць,


А яно памеж камлямі
Залаценькімі раямі
Заснуецца, задрыжыць

І на дол, ўжо амярцьвелы,
Так пакорліва, нясьмела
З ціхім шолахам ляціць...

Ціха ў гаю і маркотна,
Толькі лісьцечка гаротна
Нешта смутнае гудзе.

Ў гэтай мове ападаньня
Песьню нуднага зьмярканьня
Думка чулая вядзе.

16.х 1916 г.



ДАРОГА.

Ад кургана—да кургана,
Ад гая—да гая
У пяць нітак лягла цьмяна
Пуціна крывая.

То лясок, то луг, то поле,
То лужок зялёны...
Эх, прастор! эх, воля, воля
І балот разгоны!

І куды бяжыш, дарога,
Тканка ног і кола?
Ды маўчыш, пуцінка строга,
І маўклівы долы...

Ну, што-ж? далей! гайда далей
За узгоркі тыя...
Ня трымацца нам: мы—хвалі—
Ціхія, рачныя.

16/х 1916 г.

ГАЙ.

Люба ўспомніць гай зялёны,
Сосен пышныя кароны,
Гурт прыўдалых іх камлёў.
Дзе так ціха, так прывольна,

Дзе і сам жывеш сулольна
З жыцьцем хвой і тых дубоў.
Што як хлопцы, тут стаялі
І на хвоі паглядалі,
Як на панначак-дзяўчат.
Я пагульваў тут маўклівы
Ды спакойны, ды шчасьлівы,
Думкі думаліся ў лад.
Эх, ты, гай! Ня раз, бывала,
Тут душа адпачывала,
Сэрца цешылась, ды чым?
Толькі-ж хто пра гэта знае?
Ты, ды я, ды маладая...
Хто? про тое памаўчым...

3/IX 1916 г.

ГУСІ.

Гусі, гусі, вырай вольны!
Сумен крык ваш, гусі!
Ляціцё вы ў сьвет раздольны
З нашай Белай Русі.

Засмуткуюць зноў балоты
Бяз вас, госьці лета;
Занудзяцца, як сіроты,
Лозы там да сьвета


Што-ж? ляцеце—для свабоды
Вам і крыльле служаць...
Толькі-ж шкода чагось, шкода—
Па вас галі тужаць,


І гаруе сіратлівы
Ў чырвань лес адзеты...
Ой, вы гусі! панясьлі вы
За сабою лета!

22/IX 1916 г.

ПЕРАД ВОСЕНЬНЮ.

Што задумалась,
    Зажурылася,
Даль шырокая,
    Неаглядная?
Думкай горкаю,
    Невясёлаю
Зьвіс туман сівы
    Над курганамі.
А ў палёх даўно
    Жыта зьвезена;
Коска, серп крывы
    Працу скончылі.
Агаліўся луг,
    Даўно скошаны,
Толькі вежамі
    Стогі высяцца.
А зірнеш на лес,
    Сэрца сьцісьнецца:
І маркотна ў ім
    І нявесела!
Пажаўцеў убор,
    Пышны ліст яго
І ціхусенька
    Асыпаецца.
Сьціхлі песенькі
    Вольных пташачак...
Глуха лес маўчыць,
    Думку думае.
Знаць, ён думае
    І маркоціцца
Па вясьне-красе,
    Залатой пары...
Эх, пануры лес!
    Ня журыся, брат!
Для вясны тваёй
    Біта сьцежачка.





Жыцьцё новае
К табе вернецца,
Зашуміш ты зноў
Гучна лісьцямі;
Засьпяваеш ты
Разам з пташкамі

І хвалу сьпяеш
Жыцьцю новаму.

А мая вясна,
Мая мілая,
Ўжо ня вернецца,
Не, ня вернецца!

Што ж задумалась,
Зажурылася,
Даль шырокая,
Даль маўклівая?

30/VII 1910 г.


ЗАХАД СОНЦА.

Дагараў дзень, і зьнікалі
Ціха яго блескі,
Ў шэрым змроку прападалі
Гай і пералескі.

Над раўнінай сьнегавою
Чырваньню пажара.
Як бы стужкай залатою
Зьяла ў блеску хмара.

І ўзьняліся і загралі
Два слупы ад сонца,
Чуць прыметна ў іх дрыжалі
Хмарак валаконцы.

Блеск па небу разьліваўся
Хваляй залатою.
Я стаяў і любаваўся
[illegible]ўнаю гульнёю.



І далёка скрозь па полі
Гладзь сьнягоў бялела.
Я глядзеў—душа па волі
Плакала і млела.

І ўзьнімаўся дым клубкамі,
Зьлёгка пазлачоны.
І з апошнімі касамі
Зьнік і слуп чырвоны.

І я думаў, што ў ваконцы
Ты, як я, стаяла,
На апошні погляд сонца
Ў смутку пазірала.

27/I 1911 г.

ДА ВЯСНЫ.

Мароз, зіма,
Сьнягі вакол,
І сьпіць трава,
Пад сьнегам дол.

Мяцеліца,
Вятры гудуць,
Ў лугох дубы
Шумяць, равуць...

Ці скора-ж ты,
Жаданны час
Вясны-красы,
Ідзеш да нас?

Ідзі, згані
Сьнягі з палёў
І вывядзі
Раку з акоў!

Акрый лугі,
Адзень лясы
На жыта кінь
Крышталь расы!

Сагрэй ты нас,
Цяплом абвей!
Ідзі, вясна!
Ідзі скарэй!

30/I 1911 г.

ПЕСЬНІ ЗІМЫ.

Люблю я зімы з маразамі,
Завеі белыя ў палёх,
І сьнегу скрып пад палазамі,
І ціш зімовую ў лясох.

Люблю я ветру сьпеў гаротны
Ў мужычых комінах глухіх,
На полі белыя палотны,
Абрусы хмарак сьнегавых,

Што засьцілаюць лугавіны
І далі ціхія палёў.
Мне любы ёлкі і хваіны
Пад белай наміткай сьнягоў.

У гэтых зьявішчах свабодных,
Ў малюнках гэтых халадоў
Так многа песень, сэрцу родных,
Ўспамінак мілых мне дзяньkоў.

8 XI 1916 г.

* * *

Дай, зірну ў сваё ваконца—
Сьнег і сьнег вакол, зіма.
І нейк цесна, як ў палонцы,
Ўсё цяжэй зьвісае цьма.

Там, за ярам, лес дубовы
Чуць сінеецца праз бель.
Ня чутно ніякай мовы,
Ўсюды белая пасьцель.

І стаяць маўкліва хаты,
Ў яр упёрліся двары.

Ўсё маўчыць, бы сон заклёты
Навялі тут ведзьмары.

Толькі зрэдка між крыжамі
Разгалосіцца ўдава,
Ды ў яру дзесь вечарамі
Сьвішча жудасна сава.

І над гэтаю магілай
Жыцьця цёмнага людзей
Гостры жуд таемнай сілай
Налягае ўсё цяжэй.

25/XII 1919 г.

МЯЦЕЛІЦА.

Нізка зьвісьлі над зямлёю
Хмары сьнегавыя.
Нудна плачуць над ракою
Лазьнякі густыя.

Лес гудзе, дрыжаць галіны,
Стогне бор хваёвы,
Глуха стогнуць верхавіны,
Гнуць свае галовы.

Белай мглою ўсё закрыта,
Сыпле сьнег. Шугае
Вецер сівер і сярдзіта
Гурбы пасыпае,

Ўсе дарожкі замятае,
Круціць сьнег і носіць,—
Дзікім зьверам завывае,
Жаласна галосіць...

Ой, ты вецер, сын прастору!
Смутна ты галосіш.
Ці ня наша гэта гора
Ты ў палёх разносіш?

10/I 1910 г.

ЗІМА.

Напышлі марозы,
Рэчкі закавалі,
Белыя бярозы
Інеем убралі.

Замялі дарогі
Ветрыкі снягамі.
Лес, як дзед убогі
З белымі вусамі,

Апусьціў галіны
І стаіць гаротна,
Зрэдка верхавіны
Загудуць маркотна.

Мяккая пярына
Вочы адбірае;
Белая раўніна—
Ні канца, ні краю!

Пад пялёнкай белай
Травы і лісточкі.
Поле анямела,
Змоўклі ручаёчкі.

І схіліліся лозы,
Чуць гальлём хістаюць,
А ў палёх марозы
Ды вятры гуляюць.

16/XI 1910 г.

НА ПАВАРОЦЕ.

Мяне ўжо радуе і тое,
Што ночка стала убываць,
І што ад мёртвага пакою
Пачне прырода ажываць;


Што з кожным днём бліжэй к вясне мы,
Калі абудзяцца гаі,

І сон палёў, спакой іх немы
Пабудзяць з шумам ручаі.

Няхай шумяць вятры у полі
Халоднай злоснаю зімой,
Адну зіму мне быць ў няволі
За мураванаю сьцяной.

А там вясна, і блізка воля;
Другі раз родзішся на сьвет,
А леса шум і песьня поля
Сатруць з душы нягоды сьлед.

11.XII 1910 г.



КОЛЯДЫ.

Там, на волі, за сьцяною
Людзі чуюць, што жывуць,
І з вясёлай суятою
Вечароў калядных ждуць.

Ў цесны круг сямья зьбярэцца
За сталом каля гаршка,
І прыветней мігатнецца
Блеск ў ваконцы мужыка.

Ад каляд па вадахрышчы
Будуць весела гуляць,
Вечарамі на ігрышчы
Бубен, скрыпкі зазьвіняць.

І сягоньня, як і ўчора,
Пойдуць сьцены хадуном,
Хоць на момант сьціхне гора
Перад чаркаю з віном.

Крык і гоман, шум і песьні...
Як разыдуцца у мароз,
Не адно рабро там трэсьне,
Не адзін стаўчэцца нос.

П'юць, гуляюць ўсе багата,
Шум, ігрышчы, куцерма,
Адным словам, ўсім там сьвята,
Толькі нам яго няма.

Тыя-ж краты, тыя-ж дзьверы
Дзень і ночку пад замком,
Той-жа звон, ліхі бяз меры,
Рэжа сэрца, як нажом.

Што-ж? гуляйце! Безгалоўе
Бутлям, скваркам, куляшу!
Я-ж за ваша ўсіх здароўе
Пайку хлеба упішу.

31/XII 1910 г.

ВЕЦЕР.

Пагуляў на волі
Вецер лёгкакрылы,
Пагуляў і будзе:
Адпачынь, пахілы!

Паламаў ты лесу,
Стрэх сарваў ня мала,
З хмарамі і з громам
Спрэчку вёў, бывала.

Рваўся ты к прастору,
Ў стэп шырокі, сіні,
Дзе закалыхалі
Ветрыка пустыні.

Што-ж? уляжся, вецер,
Хоць ў чужой даліне!
Ды й ці ня ўсё роўна,
Дзе цябе ня кіне

Доля бедачына,
Мачыха ліхая,
Бо ня маеш, браце,
У сьвеце свайго края...

Пагуляў на волі,
Вецер лёгкакрылы,
Пагуляў, улёгся
І заснуў пахілы.

3/VI 1911 г.

* * *

Надрывайся і шумі.
Вецер-сівер, ў полі!..
Як сярдзіта ты ні дзьмі,
Ні гуляй на волі;

Як дарог ні замятай
І малых трапінак,
Як ты злосна ні сьпявай
Мужыку ў камінак,—
Усё-ж ты сьціхнеш і цяплом
Скора ты павееш
І з рэкітавым кустом
Міла задурэеш.

20/I 1910 г.

НА НІВЕ.

— Гэй, мой конік! гэй, мой сівы!
Ну, яшчэ, маленькі!
Варушыся, гэй, ня бойся,
Конік мой сівенькі!—

Ў полі зранку за сахою
Аратай гукае,
Сіўку, друга ў цяжкай працы,
Просіць-панукае.

Сам бяз шапкі, босы ногі,
Грудзіна раскрыта;
Б'юць камені аб нарогі,
Скрыгацяць сярдзіта,

І шуршаць пяскі буйныя,
Як жарства рачная,

Ходзіць подскакам ў дрыготках
Сошачка крывая.

Аратай ідзе спавагу,
Мерна, крок за крокам.
Вузка доўгая палоска,
Не акінеш вокам.

Пройдзе баразну аратай,
Сошку падтрасае,
Сам назад ўвесь падаецца;
Конік службу знае:

Сам заходзіць без панукі,
Без каманды, сраўна,
Аж нейк глянуць на сівога
Люба і забаўна.

Нібы знае сівы конік
Думкі аратая,
І яго панукі-крыку
Сіўка не чакае.

Аратай-жа, завярнуўшысь,
Спыніць друга-сіўку,
Слова ласкавае скажа
І папраўіць грыўку;

Гладзіць коніка па шыі,
Мух дакучных гоніць,
Як бы з самым лепшым другам,
З сіваком гамоніць.

— Змардаваўся? адпачынь, брат!
Пастаім, пакурым;
Вератнік мы гэты скончым,
Спачываць патурым.—

Конік трэцца галавою
Аб яго кашулю;
Адпачыўшы, зноў ён цягне
Сошачк' крывулю.

А аратай, задуменны,
Зноў ідзе ступою.
Моцна, моцна іх зрадніла
Праца за сахою!

— Гэй, мой конік! гэй, мой сівы! —
Носіцца па полі.
Конік, сошка і аратай
Мерна йдуць паволі.

Эх, ты поле! колькі сілы
Тут затраціць трэба!
Цяжка, цяжка дастаешся
Ты, кавалак хлеба!

22.V 1911 г.

√ ГОЛЬ.

Голь абадраная, голь неакрытая,
Злою нядоляю моцна прыбітая!

Няма табе, горкай, ніколі спакою —
Ў весну і у лета, у восень, зімою...

√ Людзі бяздомныя, людзі бязродныя!
Поўняцца вамі астрогі халодныя;

√ Там холад і сырасьць і вецер сьвідруе,
Там твае скаргі ніхто не пачуе...

√ Што-ж цябе гоніць, голь неакрытая,
Голь бедачыная, Богам забытая?

6.X 1910 г.

√ СТАРЫЯ ПЕСЬНІ.

Скарга нязьменная, гора нязбытае...
Голь змардаваная, голь неакрытая,
Беднае, цёмная голь!

Заўжды сцагнаньнем мяне спатыкаеш,
Заўжды ты душу маю спавіваеш
Ў цяжкую тугу і боль.

Стогне з табою і даль сіратлівая.
Ціш гэта немая, шыр маўчалівая
Ціхіх разлогаў-палёў.

Чым-жа пацешыць вас, людзі пакутныя?
Як разагнаці вам думкі ўсе смутныя?
Гора ня сьціхне ад слоў.

30/III 1914 г.

НА ПОЛІ.

Шэпчуць згодна каласінкі,
Гойдаюцца нівы;
Ходзіць гоман срэдзь збажынкі,
Мілы і шчасьлівы...

Колькі шуму ў нашым збожы,
Сьпеву і гаворкі!..
Як вы мілы, як прыгожы,
Родныя узгоркі!

Як старанна заараны,
Поле, твае скаты!
Межы кветкамі убраны
Пышна і багатэ.

Над жытамі песьні льюцца,
Толькі сонца ўстане.
Люба глянуць, азірнуцца,
Стаўшы на кургане!

Разгарнулась поле кругам,
Як кілім зялёны,
То ўздоўж лавай, то дзе цугам
Ў даль бягуць загоны.

Па краёх палёў шырокіх
Цёмны лес сінее.
Колькі ў полі адзінокіх
Грушак зелянее!

Там, пад наміткай туманаў,
    Відзен гай сасновы,
Што прабег паўзьверх курганаў,
    Як дзявочы бровы.

А над гэтым ўсім прыветна
    Нахілілась неба;
Сьвеціць сонца, незаметна
    Поўніць колас хлебам.

Шэпчуць нівы ў полі згодка,
    Гнуцца каласамі.
Ой, ты, поле! гай ты, родны!
    Толькі-ж я ня з вамі!

Толькі ў думках я вас бачу,
    Шум здалёк ваш чую;
Я бяз вас тут годы трачу
    I па вас гарую.

18/III 1910 г.

ПЕСЬНЯ ЖНІВА.

Жарыць сонца бяз літосьці,
Варам пыша ад палёў,
Трэцца жыта ў пыл на просьце,
Зерне сыплецца далоў.

Хоць бы хмарачка дзе ў небе,
Хоць бы рэдзенькі цяпёк,—
I бяз часу ў цьвёрдай глебе
Сьпее грэчка і лянок.

Душна ў полі і маркотна.
Постаць жоўтая хлябоў
Ціхім шолахам ґаротна
Просіць жнеек і сярпоў.

Вось прышлі і жнейкі ў поле,
Заскакаў крывы сярпок.
I панёсься на прывольлі,
Ціхі будзячы дзянёк.

Голас гучны і пявучы,
Як вясенька, малады,
Сакавіты і цягучы,
Поўны тугі і нуды.

Пакаціўся ён мяжою
І адбіўся паміж гор,
Потым дробнаю сьлязою
Ў неба вырваўся, замёр.

Многа смутку ў песьні жніва!
Хто той смутак парадзіў?
Ці ты, доля нешчасьліва?
Ці ты, журба бедных ніў?

Ці то вы, палі няплодны,
Горам песьню абвілі,
Каб нідзе пра край свой родны
Мы забыцца не маглі?

1/VIII 1912 г.

МЕСЯЦ.

Ціха месяц адзінокі
Ходзіць ў небе над зямлёю.
Неразгаданы, далёкі.
Што ты бачыш пад сабою?

Бачыш сьлёзы ты людзкія,
Як з расою тэй ліюцца.
Як ў тумане думкі злыя
Горкім плачам аддаюцца.

Як бяз долі і бяз хлеба
Працавіты люд наш гнецца...
Кінь ты жальбу нашу ў неба—
Няхай неба ўскалыхнецца.

„Р Ы Н У!“

Было і зьвялося—сьвет іншы паўстаў...
А вось што мне дзед мой нябошчык казаў:

Ў сяле была хата на дзьве палавіны.
Прасторны абедзьве, як тыя адрыны.

Але пуставала адна палавіна:
У ночы, як пойдзе апоўнач часіна,

Прыходзіць ціхутка туды Невядомы,
Прыходзіць нявідны, стаіць нярухомы

І толькі гаворыць: „Ой, рыну ж я, рыну!"
І кожны, пачуўшы такую навіну,

Скарэй бег наўцекі, бег вон з гэтай хаты...
І што ты парадзіш?—Той дом быў закляты.

Чаго ні рабілі: вадой акраплялі,
Папоў і ксяндзоў там маліцца склікалі,

Сваё вядзе «Рыну», і хата пустуе.
Але раз пад вечар салдацік вандруе:

Прыходзіць служывы. „Эй, добрыя людзі!
Прыпынак салдату на ноч ці ня будзе?"

—І рады-б, саколік, ды ліха такое:
Ня будзеш мець, родны, ўсю ноч ты пакою.

Ёсьць у нас хата, але заклятая:
Там «Рыну» ўсё ходзіць і сон адганяе.—

Патыліцу джургнуў салдат і гаворыць:
—Няхай сабе рыне, ня буду з ім спорыць.—

Паслалі салдату, як добраму пану.
—Пабудзіце, братцы, як сам я ня ўстану.—

Салдат пацягнуўся і выпрастаў ногі,
Салодка зяхнуў так, вядома з дарогі,

Як пласт, паваліўшысь на мяккае сена
(На ўсякі выпадак пад бок ўзяў палена).

Даўно не ляжаў наш салдацік так пышна.
Ляжыць ён спакойна, крыху такі сьцішна,

Але сваё права ўсё-ж сон забірае
І вочы салдату драмком засьцілае.

Вось поўнач падходзіць, магільная ціша,
Вакол ўсё замёрла, здаецца ня дыша...

Салдат здрыгануўся, прыслухаўся—„Рыну!“
Пабеглі мурашкі на плечы, на сьпіну,

А страх неадступна ўсё: «рыну!» ды «рыну!»
Ды так няпрыемна, ды так надаедна!

Ня вытрываць, чуе салдацік наш бедны.
Давай абувацца, забыў і палена,

І верціць анучы, прыгнуўшы калена.
А тут, як на ліха, і бот згубіўся,

А „Рыну“ над вухам, бы шэршань убіўся,
І дудзіць ды дудзіць усё „рыну! ой, рыну!“

—Не, брат, дарма ты, а бот я ня кіну!
Казённыя рэчы важней тваёго „рыну“.

Салдат аж пацее, хапаецца, рые—
Няма таго бота, а „рыну“ аж вые—

Няма з ім ратунку у проклятай хаце.
—Рынь! рынь-жа, брадзяга! рынь, згінь твая маці!

Цярпеньня ня стала, салдат узлаваўся.
І што-ж? гэты „Рыну“ у момант распаўся.

Напоўнілась хата ў міг срэбраным звонам,
І сыпнулі грошы дажджом няшчысьлёным.

20/X 1916 г.

НЯШЧАСНАЯ МАЦІ.

У кожную ночку, як сьвет заціхае,
І зоркамі гляне гара,
Халодныя нутры зямля раскрывае,
З тых нутраў выходзіць мара.

Ідзе яна ціха, як ночка, панура,
Ідзе пад крыжы-растанцы,
Стаіць нярухома, выглядвае хмура —
Усе аглядае канцы.

І далей бяз шуму ідзе на балоты,
Ідзе, некрануўшысь расы,
І плачуць ёй сьледам пудліва чароты,
І ціха шумяць ёй лясы.

Абходзіць магілы, на прыклад садзіцца
І сёлы вартуе яна,
Па роднаму краю снуе і цяніцца,
Заўсюды панура, адна...

* * *

І людзі гавораць, што часта чувалі
Апоўначы плач на палёх,
І часта кабету адну сустрачалі,
Гаротную, ўсю ў рызманох.

І чулае вуха той плач улавіла.
«Ой, дзетанькі!» — плача яна:
«Ці-ж я за тым вас на сьвет парадзіла,
Каб век заставалась адна?

Каб крыўдзілі людзі і жыць не давалі?
За што-ж вы зракліся мяне?
За што вы матулю жывой пахавалі?»
Так плача ўсё здань ў цішыне.

11/VIII 1912 г.

У Н О Ч Ы.

Над калыскай матка
Ночку каратае,
Хворага сыночка
Цешыць, забаўляе.

На цьвічку павешан
Начнічок убогі;

Ў вокны зазірае
Месячык двурогі.

Карагоды зорак
Угары мігаюць,
На зямлі сьняжынкі
Сінім блескам зьяюць.

Так спакойна ўсюды,
І такая ціша!
Хворае дзіцятка
Неспакойна дыша,

Забівае кашаль,
Не дае спакою.
— Сьпі, маё дзіцятка!
Сьпі, маё любое!

Ня пужайся, мілы!
Бог сьвяты з табою!
Вон пайшоў ты з хаты,
Сівы дзед з кульбою!

Унь, пайшоў дзед сівы,
Крывіцца і плача...
Уцякай аргэтуль!
Уцякай, бядача!

Ось які дзед гэты:
Думаў напалохаць!
Будзе ён ўсю ночку
На марозе охаць.

А не хадзі ў хату,
А ня лезь сьляпіцай!
Плач цяпер і мерзьні
Ды ня будзь дурніцай...

О! Пятрусь харошы!
Любяць ўсе Пятруся:
Любіць яго тата,
Любіць і мамуся.

Купіць тата Пётру
Боцікі на ножкі;
Пойдзе мой сыночак
Пракладаць дарожкі.

Новую кашульку
Я табе пашыю,
Ў цёпленькай вадзіцы
Чысьценька абмыю.

Будзеш ты харошы!
Цётка не пазнае.
— А чый гэта хлопчык?—
Дзядзька запытае.


Ўсе дзівіцца стануць
І хваліць Пятруся.
— Гэта я,—ты скажаш.—
Я—сынок Габруся!—

Поўнач пракрычалі
Пеўні ў хату з хаты,
Ўсё курыць газьніцы
Блеск падсьлепаваты.

Змучана кабета
Мацярынскім горам
І схілілась ціха
Над сыночкам хворым

І калыша сына,
Страхі адганяе,
А самой ёй сэрца
Нешта сьсе, сьціскае.

3/XI 1910 г.



ГОРА МАЦЕРЫ.

За сялом у полі,
Ў жоўценькім пясочку,
Пахавала маці
Маладую дочку.

Зьнікла яе радасьць,
Старасьці апора,
І няма уцехі
Ў мацярынскім горы.

Ёй ніхто ня верне
Дарагой дачушкі.
Плачуць па дзяўчыне
Сваякі і дружкі.

Плача па ёй мілы,
Жаль яго вялікі,
Яго-ж гора сьціхне,
Змоўкнуць сэрца крыкі.

Ганначку забудуць
Сваякі і дружкі,
Не забудзе маці
Родненькай дачушкі.

Не загояць часы,
Бо глыбокі раны,
Сама ляжа маці
З імі ў гроб драўляны.

27/XI 1910 г.

МАЦЕРЫНА ПРЫЧЫТАНЬНЕ.

Верхам крыжастым узьняўшысь высока,
Хмурыя елкі панура шумяць;
Дзе-ня-дзе вынікне дуб адзінока,
Дзе-ня-дзе вязы, як вежы, стаяць...

Дзікае месца! Усё лес і балоты,
Купін мільёны, кусты лазьняка:
Боязна шэпчуць ў балоце чароты,
Глуха, трывожна шуміць асака.

Лозы і травы штось цемнае баюць.
Што? невядома для нашых вушэй.
Нутры лясныя спрадвеку хаваюць
Нейкую тайнасьць ад вока людзей.

Чэрная грэбля лягла срэдзь балота,
Хворaст, бярвеньні, як рэбры, тырчаць;
Грэбля паганая, грэзь і плюхота,
Мова нядобрая ходзіць пра гаць.

* * *

Каля грэблі за балотам
Людзі начавалі:
Аж з-пад Пінска шлі пяхотам,
Тавaрыну гналі.

Сутунела. Ў цёмным лесе
Галасілі совы.
Нікла ў змроку ўсё Палесьсе,
Бор драмаў вяковы.

На балоце з чаратамі
Лазьнякі шаптaлі.
Дзесь у пушчы за дубамі
Пугачы крычалі.

Месяц бледны срэбрам ліўся
У нетры ночкі шэрай.
Люд гудзеў і варушыўся
Заняты вячэрай.

А касьцёрчык так прыветна
Мігацеў, сьвяціўся,
І над лесам чуць заметна
К небу дым ўзнасіўся.

Залатымі матылькамі
Іскаркі лятaлі
І высока над лістамі
Гасьлі, прападалі.

Зоркі ціха мігацелі,
Разубраўшы неба.
Вось, вячэраць людзі селі—
Не хваціла хлеба.

— Слухай, Піётра: зьбегай к маме
Возьмеш хлеба, сала—
(А за грэбляй між лясамі
Іх сяло стаяла).

Так дзед кажа да Пятруся,
Хлопчыка малога.
— Калі-ж, дзедка, я баюся
Злыдзеня ліхога.

— Сьмейся, хлопча: мы-ж тут блізка,
А там зараз хаты;
Чуць што зьмерклась, месяц нізка,
Чуй—пяюць дзяўчаты.—

* * *

Месяц вышай усё ўсплывае,
Поўнач недалёка;
Вось і сітца чуць мігае—
Ледзьве зловіш вокам.

Позны час, але ня сьпіцца
Базылю старому:
— Што магло б там прылучыцца
Пятрусю малому?

Што дагэтуль ня прыходзіць?
Час вярнуцца з дому!—
Думка ў дзеда думку родзіць,
Неспакой старому.

* *

— Піётра дома?—дзед спытаўся.
Тыя пазіраюць.
І трывога, рух падняўся.
— Го-го-го!—гукаюць.

* * *

Сярод грэблі, між бярвеньня,
Весь гразёй заліты—
Божа мілы! вось здарэньне!—
Як бы кім забіты.

Трупік Пётры знайшлі людзі,
Што ганялі стадка.
Прыйшла маці, б'е у грудзі,
— Ой, дзіця, дзіцятка!

Мой сыночак, залаценькі!
Ой, ачнісь, зірні ты!—
А ён, бедны, няжывенькі,
Вочачкі закрыты.

⁂

З таго часу, чалавеча,
Толькі ночка гляне,
На тэй грэблі голас нейчы
Прычытоўваць стане—

На тым месьце, дзе маленькі
Быў Пятрусь забіты—
— Мой сыночак, залаценькі!
Ой, ачнісь! зірні ты!

19.IX 1910 г.

НА АДЗІНОЦЕ.

Між глыбокіх сьнягоў,
Дзе лес глуха шуміць,
Ціхі дом лясьнікоў
Адзінока стаіць.

Воўчым вокам вакно
У цемні ночы блішчыць.
Дзеткі сьпяць ўжо даўно,
Толькі матка ня сьпіць,

Смыча нітку яна,
Ўсё кудзельку прадзе.
Глухата, цішыня,
Толькі уюга гудзе,

Завывае, як зьвер.
Стогне вяз над страхой.
Страшна ў лесе цяпер,
Сьцішна ў хаце адной.

Ды прывыкла яна
Да паўночы сядзець
І скрозь шыбы вакна
Ночцы ў вочы глядзець.

Я у коміне зноў
Вецер песьню пачаў;
Вось ён глуха завёў.
Як жабрак засьпяваў.

Ў гэтай песьні глухой
Сьлёзы гора чутны,
Плач і енкі з мальбой
Адзінокай душы.

* * *

—Мама! страшна мне тут,
Я баюся адзін:
Унь варушыцца жмут
На ашэстку аўчын!—

Сын малы, Васілёк,
Кліча матку к сабе.
—Бог з табою, сынок:
То здалося табе!

Ня пужайся, дурны:
То аўчынкі вісяць,
Няжывыя яны
І ня могуць чапаць.—

—Мама! сядзь, ідзі тут..
Што так страшна гудзе?—
Ставіць прасьніцу ў кут,
К сыну матка ідзе.

—Мама! чуеш: во—во!
Хтось па даху пабег!
Гэта злодзей ці хто?—
—Не, сынок: гэта сьнег.—

—А што трэба яму?
Чаго ўзьлез ён на дах?
Ці ён грозіць каму?
Ці спужаў яго страх?

— Ой, блазнота мая!
Ну-ж, з цябе і сьмяляк!
Чаго думка твая
Улякалася так?

Гэта-ж вецер, сынок!
— Ён жывы, ці які?
— Да--не, мой галубок:
Гэта воздух такі!—

— А што робіць ён?—Хто?—
— Ну, той воздух! скажы?
— Няма ведама, што
Ты пляцеш ўсё—ляжы!—

Васілёк замаўчаў,
Нярухліва ляжыць,
Мусіць думаць пачаў,
Чаго вецер шуміць.

А ён, быццам той зьвер,
Плача, вые, гудзе.
— А дзе тата цяпер?
Чаму доўга ня йдзе?..

Не баіцца адзін
Ён у ночы хадзіць!—
— Тата дужы, мой сын.
За плячыма вісіць

Стрэльба, нож пры баку.
Дык баяцца чаго?
Кепска будзе ваўку,
Калі чэпіць яго!..

— Мама! праўда ці лгуць.
Што маленькіх дзяток

Жабраком аддаюць
Заміж хлеба ў мяшок?

— Не, ня праўда, сынок!
Гэта байку сплялі;
Проста страшаць дзяток,
Каб паслушны былі.—

Зноў заціх Васілёк
І пытаць перастаў,
Зноў яго разумок
Варушыцца пачаў.

Ціха ў хатцы малой,
Смутна лямпа гарыць.
Бор стары зз сьцяной
Усё шуміць ды шуміць.

13/х 1909 г.

ДУМКІ.

Дрэмлюць думкі цяжкай дрэмай,
Поўныя трывогі;
Ім на сьвет з магілы немай
Не прабіць дарогі;

Ім няма дзе прыхінуцца,
Хоць і сьвет зьлятаюць.
А часамі, як ачнуцца,
Жаласна ўзыграюць;

Усё смуткуюць сэрца дзеткі,
Што мы тут у няволі,
Што пасохлі жыцьця кветкі
Без пары, бяз долі;

Што мы гора збыць ня ў сілах,
Крыўды не зваюем,
Што, быць можа, да магілы
Долі не пачуем.

Не смуткуйце ж вечарамі,
Думкі, гора дзеці!
Хоць мне цяжка, толькі з вамі
Не адзін я ў сьвеце.

Тускна жыцьце, ні іскрынкі,
Ў кут яно забіта;
Толькі з вамі, сірацінкі,
Гаманю адкрыта.


1/іх 1910 г.

* * *

Я помню, быў і я багаты,
Я жыў, як багач, у дабры,
І ня міналі мае хаты
Мае найлепшыя сябры.

Мяне дзяўчаты ня цуралісь,
Плялі вяночкі з красак мне
І мне шчасьліва так сьмяялісь,—
Ды толькі-ж то было... у сьне.

19/хіі 1909 г.



КРАСКА.

Краска мілая мая,
Госьця веснавая!
Як ты хараша цьвіцеш
Тут, ў глушы, любая!

З ціхім усьмехам з табой
Вецярок жартуе,
І цябе ў вясёлы дзень
Сонейка цалуе.

Што-ж на тварыку тваім
Лёгла задуменьне?
Што ня весела глядзіш,
Мілае стварэньне?

І ня радуе цябе
Дзень вясёлы мая,

Голас радасны вясны,
Песьня маладая.

Я хацеў бы адгадаць
Дум тваіх гаворку,
Я-б хацеў разьвесяліць
Краску, маю зорку.

Ці гаруеш ты аб тым,
Што і ты бяз волі,
Што краса ўся адцьвіце
Без пары і долі?

Ці па тым, што вецярок
Разлучыў з лугамі,
Дзе-б магла ты размаўляць,
З пчолкамі з чмялямі.

Я любуюся табой,
І мне смутна стане,
Што ў вастрозе хараство
Ўсё тваё завяне;

Што адна ты адцьвіцэш
Век свой сіратою,
А багата адарыў
Цябе май красою.

Краска, красачка мая,
Мілае стварэньне!
Што-ж на тварыку тваім
Лёгла задуменьне?

31/v 1910 г.

ВОСЕНЬНЮ.

З узгорку ў лагчыну дарожка зьбягае,
Дубы наабапал лагчыны стаяць,
А хвалькі крыніцы ім, Бог сьвяты знае,
Аб чымся, знаць, важным шумяць і шумяць.

А хвоі-суседкі і цёмныя ёлкі,
Як смутныя ўдовы, стаўпіліся тут,
Даведацца хочуць і траўкі і зёлкі,
Якія навіны прыйшлі ў гэты кут.

І ўсе не спакойны, ўстрывожаны моцна,
Чагось та чакаюць, і боязна ўсім.
А вецер-задзіра гудзе, як нарочна,
Шуміць і халодзіць дыханьнем сваім.

Дзярэўі трывожны і лісьце раняюць,
І з шолахам ціхім убёр іх ляціць.
— „Ня бойцеся, брацці!“ ім гусі гукаюць:
„Зноў, дасьць Бог, вясною вада зашуміць“

З узгорку ў лагчыну дарожка зьбягае,
Дубы наабапал і клёны стаяць...
Ці помніш ты час той, скажы, залатая?
Аб чым твайму сэрцу дубы шапацяць?

РАСТАВАНЬНЕ.

Вечарэла і цішала,
І гушчалі цені;
Поле моўчкі пазірала,
Лес быў ў задуменьні,

Той стары лес, праз каторы
Нам была дарога;
А над намі, на прасторы
Божага разлога,

Хмаркі згодна шлі куды-та
Доўгаю градою.
Смуткам даль была спавіта,
Як мы шлі з табою.

Удоўж дарогі разрасталісь,
Высілісь хваіны,
І маўчалі, не гайдалісь
Лапы іх, галіны...

Пастаялі, разьвіталісь
Мы з табой у лесе,
Разышліся і схавалісь
Мы ў густым навесе

Маладых яліні хвояў
І бяроз пахучых.
Жаль растаньня сэрца кроіў,
Горкі жаль, пякучы.

Я спыніўся. Сэрца млела,
Сьціхшна стала ў лесе.
Толькі лісьце шапацела,
Як той дождж па стрэсе

Ўвечар восені пастылы,
У змрок спавіты шэры,
Як зьнікаў твой вобраз мілы,
Дарагі бяз меры.

3/х 1915 г.

АПОШНІ ЛІСТОК.

Ў апусьцелым садку
Глуха вецер шуміць,
На галінцы лісток
Баязьліва дрыжыць.

Усе лісточкі даўно
Вецер у полі разьнёс,
Толькі гэты лісток
Моцна к дрэву прырос.

Трэпле бура яго,
Аблівае дажджом,
Разлучацца-ж яму
Шкода з родным гняздом.


З тэй галінкай, дзе ён
Радасьць жыцьця пазнаў,
Дзе ў маю вецярок
З ім любоўна шаптаў.

І blішчала на ім
Летнім ранкам раса,
Цалавала яго
Залатая каса

Сонца ў ясны дзянёк...
Ды мінуліся яны,
Тыя сьветлыя дні
Маладзенькай вясны.

Эх, аджыў ты свой век,
Жоўты ліст, бедачок,
А на весну цябе
Скіне новы лісток!

22/х 1910 г.



РАЗДУМЬЕ.

Зірну я на неба. Па сіняй раўніне
За хмаркаю хмарка плыве;
Тыя сальюцца, другая загіне,
Расплыўшысь, як дым, ў сіняве.

А тыя па небе, бясплодныя, ходзяць,
Глухія на плач збажыны.
І мысьлі тож часта бяз сьледу праходзяць,
Так сама зьнікаюць яны.

Зірну я на жыта, як ў полі красуе,
Як пыл жыватворчы над ім
Так ціха снуецца, калосьсі цалуе
Любоўным дыханьнем сваім.

Ды ўздымецца вецер і злосна павее,
Пагоніць той пыл на лясы.
У жыцьцю часьцютка ня мала гібее
Такой жыватворчай красы.

Стого днее дрэва. Раскошна галіны
Ў зелень убрала вясна,
І горда гамоняць яго верхавіны,
І радасьць ў тэй мове чутна.

А восень надыдзе, і лісьцік жалобна
На землю, пажоўклы, спадзе.
І моладасьць наша тым лісьцям падобна:
Як лісьце, яна адцьвіце.

Вось ціха сьняжынкі ў адлігу лятаюць,
Як бы матылёчкі ў маі,
Падуць і растануць, навек прападаюць,
Як роска вясною ў гаі.

І ты, чалавеча, як сьнег той ў адлігу:
Упаў, і сканаў, і няма.
З трывогай глядзіш ты ў адвечную кнігу,
І душу агортвае цьма.

29/XII 1910 г.

ВЯРБА.

Пытаў ручаёчак
Маладой вярбіны,
Што на дол спусьціла
Гібкія галіны,

Што к вадзе галоўку
Смутна пахіліла
І з паўднёвым ветрам
Ціха гаманіла:

— Адкажы, галубка,
Адкажы, любая:
Чаго зажурылась,
Мая маладая?

Без пары, бяз часу
З галавы-кароны
Ты раняеш лісьці—
Свой убор зялёны?

Чаго так жалобна,
Як бы з нейкім жалем,
Ты аб чымся шэпчаш
Маім дробным хвалям?

І чаму галінка
Сохне-умірае?
Дык які-ж вярбінка
Смутак ў сэрцы мае?—

Зашумела ціха,
Жаласна вярбіна:
— Горка мне, мой мілы,
Горка сіраціне!

Цяжка маім ножкам—
Цісмуць іх каменьні,
А твая вадзіца
Змыла мне карэньні;

Грунт мой пад нагамі
Зрыла-раскапала,
Сокі майго сэрца
Ўсе яна забрала.

Маладасьць сваю я
Марне загубіла...
Ох, на што так шчыра
Я цябе любіла?—

2, IV 1910 г.

ЖУРБА ПА ВЯСЬНЕ.

Шкода мне прыгоды Божай,
Маладой вясны прыгожай,
Шкода мне вясны!

Мне дзянькоў вясёлых шкода,
Жыцьця радаснага ўсходу,
Неба глыбіны.

Залатога блеску сонца,
Што скрозь хмарак валаконцы
Кідала лучы.

Грозна хмары падымаліс
І грамамі адклікаліс,
У небе плывучы.

Змоўклі песьні веснавыя,
Зьбеглі хмары грамавыя
У невядомы край.

Зсохлі травы, зьвялі кветкі,
Зьніклі пташкі ўнезаметкі,
Глухне, ціхне гай!

Шкода жыцьця маладога,
І так смутна, так убога
Пранялось яно!

І паніклі ў сэрцы мары,
Як ў блакітным стэпе хмары
Белае руно.

Ох, прайшлі дзянькі любыя,
Немяцежныя, сьвятыя,
Іх няма, няма!

І на душу смуткам ляжа,
Смуткам сэрца апіража
Горкая дума.

Тускна, моладась, прашла ты!
Сагнаў віхар злы, пракляты
Маю весну ў даль.

І прашла ты незаметна
У змрок ночы беспрасьветнай...
Жаль вясны мне, жаль!

26/VII 1910 г.

* * *

Год за годам уцякае,
Часам смутна стане мне,
Што вясенька маладая
Мігатнулась, як у сьне;

Толькі дзесь у сэрцы жывы
Думкі, вобразы яе;

І ня раз мне ў час тужлівы
Штось чароўнае пяе.

І так моцна сэрца кліча
Ў родны край мой адпачыць,
Сілак сьвежых там пазычыць
І пановаму зажыць.

22/х 1919 г.

* * *

Ну, якіх-жа прыгод
Ад цябе, ты мой год,
Буду спадзявацца?

Ты надзею мне дай
Зноў убачыць свой край,
З роднымі абняцца

І з народам сваім,
Сэрцу так дарагім
Ў гурт адзін злучыцца;

Родным сьпевам лясоў
Шумам траў, каласоў,
Як даўней, упіцца,

Бо сярэд чужаніц,
Неўспагадных дурніц,
Сілу марне трачу,

І аб родных кутках,
Хай ацаліць іх Бог,
Часта ў думках плачу.

22/х 1920 г.

* * *

Позна. Восень. Агаліліс
І дзярэўі і кусты;
Ветрам ўсюды пазнасіліс
Іх пажоўклыя лісты.

І стаіць лес сірацінай,
Глуха, глуха ён шуміць,
Як над голай верхавінай
Вецер злосны праляціць...

Туманамі апавіта
Даль разложная палёў;
Туга нейкая разьліта
Ў дробных кропельках дажджоў.

І аб чым ён так трывожна,
Гэты дождж, бубніць, бубніць?
Пра каго, пра што заложна
Праз ўсю ночку гаманіць?

Ці аб тым, што скора, скора
Землю сьнег а́крые, лёд?
Ці ён мне на злосьць і гора
Кажа: „Зноў мінуўся год!“

22/х 1912 г.

* *
*

...Ні красак, ні зыкаў. Замерла прырода...
Вясна маладая! Як мне цябе шкода!

Ты, ведаю, прыдзеш, ўсё прыдзе з табою,
І бліськне прырода красой маладою.

Ка мне-ж ты ня прыдзеш, вясна залатая!
І жаль нейкі сэрца маё спавівае.

Яшчэ адзін годзік пабег, пакаціўся
І з прошласьцю моцна, навекі ён зьліўся.

Стаю на парозе ўжо новага году.
Пара маладая! Як мне цябе шкода!

22/х 1911 г.

* *
*


Я стаю на мяжы...
Год мой новы! Скажы,
Што будзе са мною?

Цяжак год быў стары...
А якія дары
Ты нясеш з сабою?..

Мне ня трэба дароў —
Быў бы жыў ды здароў,
Былі-б дома жывы,

Дачакацца-б вясны,
Ды вярнуцца-б з вайны, —
Быў бы я шчасьлівы.

22/x 1915 г.



* * *

Год за годам неўзаметкі
Ўсё праходзяць, ўсё бягуць;
З імі вянуць жыцьця кветкі,
З імі сілы мае мруць.

22/x 1916 г.

* * *

Яшчэ адзін усход мінаю
І ў новы круг дзянькоў іду
І на парозе іх пытаю:
„Куды, куды цяпер брыду?“

Якая здарыцца прыгода
Ў маім блуканьні без дарог?..
Ідуць, ідуць у вечнасьць годы,
Як хмаркі ў сініх небясох.

І я-б хацеў уведаць: „Дзе ты,
Той страшны жыцьця паварот,
Калі на звод ідуць ўжо леты,
Калі з гары зачаўся сход?“

22/x 1917 г.

* * *

Я кожан год свой дзень радзінаў
Прывык ў раздумы ўспамінаць.
Якіх праяў, якіх навінаў
На год мне новы пажадаць?

А я-б хацеў, каб год мой новы
Вярнуў мяне ў мой родны кут,

На Нёман сьветлы, ў лес хваёвы,
У тыя вёскі, дзе наш люд,

Дабрэйшы ў сьвеце, лямку цягне,
Ня змогшы крыўды званяваць,
І лепшых дзён і есці прагне,
Ярэмы тыя паскідаць.

Што ім чужынцы з сваякамі
Узьдзець маніліся даўно
І засланялі ім вякамі
Ад сьвету белага вакно...

Дык дай-жа мне, мой год малоды,
Мой бацькаў вугал павітаць,
А гэты край рыжаб роды
У думках толькі ўспамінаць.

22/x 1918 г.

НА ЧУЖЫНЕ.

Час праходзіць, жыцьце гіне
Ў талачэчы на чужыне
    За кавалак хлеба;

А куды яшчэ закіне
Доля-гора ў злой часіне?
    Адкажы ты, неба!

Адказаць яно ня хоча.
Толькі вецер зарагоча
    І зарве жалобна;

Ды ўсё гоніць хмар валокны
І бубніць, бубніць у вокны
    Дождж халодны, дробны.

22/x 1919 г.

ПАД НОВЫ ГОД
(1914 ы).

Ноч глухая, цемнь, завея,
Ня відно і сьвету;
Толькі сьнег адзін бялее,
Ў іней лес адзеты.

Ні праезду, ні праходу,
Белы віхар ў полі,
Як бы тут дарожак зроду
Ня было ніколі.

Сьвішча, плача і галосіць
Завіруха злая,
Хаты, гумны,—ўсё заносіць,
Сьнегам задзімае.

Цісьне, крэпіць халадзішча,
Проста ліпнуць вочы.
Божа! што тут за ігрышча
Ў полі сярод ночы!

А хто ходзіць полем-логам
Ў сьнезе па калені?
На пакуту, бачна, Богам
Выгнаны дзьве цені.

Чаго ходзяць? што шукаюць
Сярод цьмы - нягоды?
Гэта ходзяць, азіраюць
Божы сьвет два годы.

У Старога за плячамі
Мех пусты трасецца,
Маладзы Год пад дарамі
Крэхкае і гнецца.

—Фу! мароз які пякучы,
Аж ў вачох іскрыцца!
Мерзнуць ногі праз анучы,
Нос гатоў зваліцца!—

Кажа Новы Год Старому:
— Ты спыні шум буры!
Мо' пляцецца хто да дому,
Да сваe пячуры,

Каб спаткаць мяне пачэсна,
Як вядзецца ў родзе:
З жонкай, з дзеткамі сумесна
У ладу і згодзе.

Цяжка бедным і пахілым,
Зжалься над народам!
Я хачу быць для ўсіх мілым,
Добрым Новым Годам.

Усьмяхнуўся, ўзьняўшы плечы,
Год Стары на гэта:
—Ты гаворыш недарэчы,
Бо ня знаеш сьвета.

Слухай, дружа, і вучыся!
Я ўжо—госьць на сьвеце
І хаджу, вось, трасучыся,
Ня жыхар я—сьмецьце.

Перабыў свой час і—квіта.
Ды я выпыт маю,
І ў апошні час пабыту
Слухай, што параю:

Калі хочаш, ягамосьцю,
Ў памяці застацца,
Уешся людзям добра ў косьці—
Хоць злым будзеш звацца...—

—Што пляцеш, пустапарожны?!
Проста слухаць нудна:
Добры Год больш помніць кожны!..
—Гм! згадзіцца трудна!—

І заспорылі, як дзеці,
Блазан і Старое,

Што жыве даўжэй на сьвеце—
Добрае ці злое?

Спрэчка, крык, бы зьвёў ліхі іх,
Проста чуць ня б'юцца,
Толькі торбы і мяхі іх
І кіі трасуцца.

—Ша!—сказаў Стары:—даволі!
Ты да спрэчак ласы,
Мы ня згодзімся ніколі,
Запытаем часы.—

Змоўклі. Йдуць. Вось лес прад імі
Ўстаў сьцяной магутнай,
Хвоі лапамі старымі
Б'юцца ў песьні смутнай,

І гудуць дубы нястройна,
Грозна жараламі;
Лес трасецца неспакойна,
Ходзіць ўвесь камлямі.

І чым далей, ўсё дзічэе,
Неба закрывае,
Нават вецер там ня вее,
Пушча—страх якая!

—Станьма тут!—Стары гаворыць.
Глуха на палянцы.
Ціха дрэвы штось гуторацць,
Веку выхаванцы.

Ціха ходзяць іх макушкі
Над палянкай з краю.
—Эй, вы, часы, Божы служкі!
Я вас выклікаю!—

Крыкнуў год стары, і дзіва:
З-за камлёў драўляных,
Нібы дым, ўстае маўкліва
Рад цянёў нязнаных.

Вышлі цені на палянку,
Ўсе пад нумарамі,
Ў беласьнежную катанку
Ўлезшы з галавамі.

На адных, як кроў, гарэлі
Знакі агнявыя,
А з другіх чуць-чуць глядзелі
Напісы сьляпыя.

Год Старэчы стаў прад імі
І сказаў уладарна:
—Станьце, злыя годы, з злымі,
Хто ня згінуў марна!

І вы, добрыя гадочкі,
Вечнай праўды стража!
Станьце бліжай ўсе ў радочкі,
Няхай кожны скажа,

Ці зьвялася, ці пануе
Аб вас памяць ў сьвеце,
Як кахае, як шануе
Вас патомства—дзеці!—

Так сказаў Стары, і Годы,
Добрыя і злыя,
Ўзварухнуліся, як ў нягоду
Лісьці маладыя.

Годы з напісам Чырвоным
Ўсе асобна сталі,
Мноствам страшным, нязьлічоным
Пушчу запаўнялі;

А іх напісы гарэлі
Слупам агнявістым,
Аж ў іх неба чырванела,
Пушча з сьнегам чыстым.

Годы добрыя нясьметна
Сталі ўсе па чыну.

Цьмяна, бледна, чуць прыметна,
Зьліўшыся ў раўніну.

І выходзіць цень бясшумна.
Глуха дакладае:
—Я напоўніў людзям гумны,
Я - Год Ураджаю.

Людзі трохі падабрэлі,
Ураджай хвалілі,
А як хлеб мой яны зьелі,
Дык мяне забылі.

Паліняла і зьвялася
Памяць між народу.—
Так сказаўшы, адыйшлася
Цень Ураджаю-Году.

—А я голадам вядомы,
Я—Год Галадоўлі.
Я спустошыў людзям домы,
Гумны, ўсе будоўлі.

Мерлі людзі і жывёла,
Як з атруты мухі,
Шчысьціў я ім ўсё да гола,
Нарабіў разрухі,

А мяне дагэтуль людзі
Часта ўспамінаюць;
Так было і гэтак будзе:
Зла не забываюць!—

Так сказала цень з крывавым,
Агнявістым зыркам.
—Я быў згодай, быў ласкавым,
Рассыпаўся макам,

Каб ўсе людзі жылі ў згодзе:
Згода панавала,
Быў парадак, лад у народзе,
Царствы сябравалі.

А прайшоў мой час, як сьмецьце,
Зьнішчылась і памяць.
Ці я быў, ці не—на сьвеце,
Нават і ня ўцямяць!—

—Я прынёс раздор народу,
Здраду, меч, пажары,
Я забраў яго свабоду—
Я—Год Помсты, Кары!

Я растрос зямлю дазваньня,
Я быў год няшчасны,
Аба мне ж апавяданьні
Сьвежы, чоткі, ясны!—

—А я сеяў зерні знаньня,
Праўды разуменьне,
Волі, радасьці жаданьне,
Я—Год Прасьвятленьня.

Мой агонь гарыць і зьяе,
Сэрцы людзям грэе,
Аба мне слых ня ўмірае,
Памяць пламянее!—

—А я сеяў мрок ў народзе,
Зацямняў галовы!..—
—Сьціхні, голас часаў! Годзі!—
Год прамовіў Новы.

І ўсё змоўкла, ціха стала,
Цені ўсе застылі,
Толькі пушча задрыжала
Хвоі ўзгаманілі.

І Стары Год стаўся ценем,
Поўнач падступала
І пячаці задуменьня
На ўсіх накладала

—Цені, згіньце! Я ўладарны
Гаспадар над вамі!

Мой прышоў час!—Цені марна
Зьніклі між камлямі.

Змоўкла пушча, сьціхла бура,
Зоры замігалі.
І зямля і лес пануры
Новы Год віталі.

І ўсё поглядам пытае
Маладога Году:
„Што нясе нам, чым спаткае
Новая прыгода?"

³¹/xII 1913 г.

* * *

Хто нам скажа, хто згадае,
Чым нас Новы Год спаткае
І парадуе нас чым?

Год мінулы злым прыўдаўся,
Тросься сьвет і садрыгаўся,
Апавіты ў гар і дым

Наш набытак зьнішчан прахам.
Неашчадным, страшным махам
Сьмерць каснулася зямлі.

На сіротах нашых—нівах
Замест снопікаў шчасьлівых
Густа косьці палеглі.

За сяўцоў былі гарматы,
Замеж зернятак гранаты
Шчыра сеялі ў той год.

Нязьлічонымі крыжамі
Сьлед адзначан, дзе з сьлязамі
Бег разбураны народ.

Гора Белу Русь спаткала,
Ў сьвет далёкі люд пагнала,—
Цяжак быў мінулы час!

Чым-жа Новы Год спаткае?
Ці ацiхне бойня тая?
Чым парадуеш ты нас?

29/XII 1915 г.

ПЕСЬНЯ АДЗІНОКАГА.

Я—адзін, жыву бяз дому,
Сам сабе я першы пан,
Галавы ня гну нікому,
Ня схіляю гібкі стан.

Я—адзін, нічым няскован,
Волен я, як дух палёў;
Ад разбойнікаў захован,
Ад усякіх зладзяёў.

Я—адзін, нічым ня зьвязан,
Мне няма над чым карпець.
Сьвет нідзе мне незаказан,
Волен ўсюды я ляцець.

Скарб мой—рукі, мой конь—ногі;
Як пайду—сам чорт ня брат!
Кій у рукі і з дарогі
Бяз нуды зірну назад.

Даражэй ўсяго—свабода.
То што плакацца дарма?..
Эх, ты, воля! толькі шкода,
Што цябе нідзе няма!

7/III 1910 г.

* * *

Эх, на што ўздыхаць па волі,
Калі я ня маю долі?

Калі марне годы трачу,
Калі сэрца ў смутку плачa?

Знаць няшчасным урадзіўся,
Што сьвет белы зачыніўся,

Зачыніўся, сыйшоў клінам...
Горка быць мужычым сынам!

Бо́гач зьяе ў пазалоце,
Мужык, бедны, мрэ ў бядноце;

У мядалях „зубр“ багаты,
А ты носіш адны латы,

Бо мужычы сын пахілы
Роўнасьць мае... срэдзь магілы!

4/x 19[illegible] г.

ПЕСЬНЯ БАТРАКА.

Я ня маю сваёй хаткі,
Я ня помню роднай маткі,

Рос я круглым сіратою,
Як той дуб, што над вадою.

Мяне матка ня люляла,
Казак, песень не сьпявала,

Чуў я толькі песьні бору,
Узгадавала мяне гора.

Хоць нядоля мяне гнала,
Ўсё-ж мне сілы не зламала:

Ці-ж я ростам ня высокі?
Ці ў грудзях я ня шырокі?

Валасы да плеч густыя,
У мяне рукі, як стальныя!

Спрытна рэжу дол сахою,
Здацен ў лузе за касою!..

Толькі-ж дол... чужы капаю,
Толькі долі я ня маю!..

Ой, пайду, пайду я ў поле,
Загукаю: „Дзе ты, доля?

Дзе ты, шчасьце? адгукніся!
Ка мне тварам абярніся!"

Толькі-ж ціха-ціха ў полі,
Толькі вецер дзьме паволі:

„Дармо жыцьце тваё гіне:—
Няма долі сіраціне!".

29. I 1909 г.

ПЕСЬНЯ П'ЯНАГА.

Я сягоньня падгуляў,
Хмель ў галоўцы бродзіць,
Кроў па жылах разагнаў,
У бок ножкі водзіць.

Скача Божы сьвет вакруг,
Знаць, і ён упіўся.
Скачы, Янка, каб ты спух!
Ці-ж ты зьверадзіўся?..

Ну, падыме жонка крык,
Будзе мяне здрадзіць...
Эх, каб бабам не язык,
Можна б з імі ладзіць!

Ды ці ж я не гаспадар
У сваёй роднай хаце?
Не пазволю крыку, свар,
Лёгшы на палаце!

Ты-ж ня бойся, не шманай.—
Што каму за дзела?
Там-там! трай-там! Та-ра-рай!
Скачы, Янка, сьмела!

Бо ты толькі бачыш рай,
Як гарэлкі хваціш.
Скачы-ж, Янка, выцінай,
Покі сіл ня страціш!

Скача Божы сьвет вакруг,
А ў ваччу траіцца,
Лезе з плеч стары кажух,
Хоча й ён ўскруціцца.

А ты, Янка, не ўважай
На кажух падраны!
Прэч з дарогі, уцякай:
Ідзе Янка п'яны!

15/1 1912 г.

„АСАДЗІ НАЗАД!"

Дрэнна маё жыцьце,
Ўсё ідзе ня ў лад,
І крычаць мне ўсюды:
«Асадзі назад!»

Божа ты мой мілы!
Б'юся я, як гад,
Толькі-ж куды выйду—
«Асадзі назад!»

Помню, я жаніўся,
Добры быў мой сват!
К дзеўцы нос паткнулі—
«Асадзі назад!»

Дзеўка была важна!
Ды сусед—Кандрат
Ногу мне падставіў—
«Асадзі назад!»

Трапіў я у горад,
Быў якраз «парад»,
Лезу я наперад—
«Асадзі назад!»

У засеках пуста,
Жыта пабіў град...
— Дай, старшынка, «ссуды!»
«Асадзі назад!»

Я з капейкі зьбіўся,
Зарабіць я рад.
— Ці няма работы?
— «Асадзі назад!»

Сам я растрапаўся,
Лезе з плеч халат.
— Памажэце, людзі!
— «Асадзі назад!»

Сына свайго ў людзі
Вывеў бы Ігнат
— Ось мой сын, паночкі!
— «Асадзі назад!»

Ў вёску хлеб прыслалі—
Там галодных шмат...
Пруся я з мяшэчкам—
«Асадзі назад!»

Галаву я маю,
Быў бы дэпутат.
— «Цэнзу» ты ня маеш—
«Асадзі назад!..»

Праўда, што таіцца?
Быў і мой чарод:
Два разы на жыцьцю
Вышаў я ўпярод.

Ўзбунтавалась вёска—
Ой, быў цяжкі год!
Прыяжджае прыстаў:
— Выхадзі ўпярод!

Гэта ты, мярзавец,
Ўзбунтаваў народ?
Гэй, гарадавые!
Даць яму ўпярод!

1908 г.

* * *

— Эй, скажы мне, небарача,
Ты, каго ў ярме трымаюць,
Чыё жыцьце папіхаюць:
Сам ты ныеш, доля плача,
Ва ўсім чысьценька нястача,

Сееш многа ты і дбала,
Хоць скупое тваё жніва,
Адкажы ты мне праўдзіва:
Што цябе тут прыкавала?
Ці у сьвеце сьцежак мала?

Або сьвет тут зачыніўся?
Ці ты глух на папіханкі?
Сьвецяць рэбры скрозь катанкі,
А праз шапку чуб прабіўся.
Ці цярпець ты век згадзіўся?

Ці ня чуў аб лепшай долі?—
— Ой, даўно-б я ўсё пакінуў,
Толькі-ж многа сьлёз я лінуў
І крыві на тыя ролі,
Дзе ўзыходзяць песьні болю.

Дык няхай сьвет хоць трасецца,
Я тут вырас, тут і згіну,
А разорак тых ня кіну,
Дзе мой смутак, жаль снуецца,
Дзе мне шчасьце не даецца.

Бо я цьвёрда веру ў тое,
Што наш засеў у полі дзікім,
Гневам вырасьце вялікім
І затопіць ён ўсё злое,
Ўсё няшчасьце векавое.

28/II 1912 г.

СТАРЫЯ ДУБЫ.

Зноў я бачу, зноў вітаю,
Як паноў вяльможных,
Панад Нёманам у гаю
Гурт дубоў разложных.

Сам ня ведаю, чым мілы,
Чым вы сэрцу любы,
Выхаванцы веку, сілы,
Магутныя дубы.

Чымся мілым, чымся родным
Ад вас павявае,
Аж мне сэрца ў сьпеў лагодны,
Ў думкі ахінае.

Ўзварухнуцца думкі-песьні,
Як вашы лісьцінкі,
І зноў станеш напрадвесьні
Жыцьцёвай пуцінкі.

Цешусь вамі, пазіраю,
Любуюся, дрэвы.
Смутна сэрцам прачуваю
Вашы думкі-сьпевы.

Толькі-ж шум я ня той чую—
І вы парадзелі,
І вы ня ўсе буру злую
Зьнесьлі і здалелі!..

Ой, асілкі ў ціхім гаю,
Векавыя дубы!
Зноў вітаю вас, вітаю,
Любы-ж вы мне, любы!

1912 г.

ДУБЫ.

На пацеху, на зьдзіўленьне
Тут дубы стаялі,
І глыбока іх карэньні
Цьвёрды грунт аралі.

Комлі, велічы грамады,
З бурамі спрачаліcь
І вакол старой пасады
Горда красаваліcь;

І гулі іх верхавіны
Гутаркаю сталай
Пра даўнейшыя часіны
Долі заняпалай;

Пра мінулыя прыгоды
Гіблых часаў, слаўных.
Тут стаялі з году ў годы
Сьведкі дзеяў даўных.

Гожым летам ці вясною,
Раніцой на ўсходзе
Штось шапталі між сабою
Ў добрым ладзе, згодзе.

Можа казкі жыцьця, долі
Ціха утваралі,
Або песьню вольнай волі
Там, ў лістох, складалі;

А мо' сонейка віталі,
Дзень хвалілі новы,—
Не, ня ўніклі, ня ўчыталі
Іх таемнай мовы.

Наляцелі-ж буры злыя,
Толькі ўжо ня з неба:
Дзеі, засевы ліхія
Узгадавала глеба.

Глеба цёмная, сьляпая,
Глеба злосьці, гневу—
Абудзілась цьма людзкая,
Плод ліхога севу...

Эх, дубы, дубы! вякамі
Вы зьбіралі сілы,
Не зваладаў віхар з вамі,
Вас здалелі пілы.

Ашальмованы вам чолы,
Сьсечаны кароны,
І, пасеўшы на верх голы,
Там крычаць вароны.

23/III 1921 г.

ГЛУХАЯ ДАРОГА.

Плачуць ціха і смуткуюць
Дзьве сястрыцы, дзьве пуцінкі,
Што ў палёх адны пустуюць
І што глухнуць каляінкі:

„Чаму конь тут воз ня цягне?
Чаму людзі тут ня ходзяць?
Ці пралеглі мы на багне?
Ці тут злыя калабродзяць?

А мы глухнем, зарастаем,
Ветры з долам нас зраўнялі,
Разлучылі з мілым гаем...
Ой, чаго-ж мы дачакалі?

Каб мы знала, то ніколі
Тут не леглі-б, не сналісь"...
— Эх, сьлед цьмяны чужой волі!
Вас пра тое ня пыталісь,

Як і дзе праедзе кола,
Дзе нага людзкая стане!—
Дунуў вецер поўзьверх долу
На іх жалабу-пытаньні.

Плачуць ў полі і гаруюць
Дзьве сястрыцы-каляінкі,
Толькі-ж плачу іх не чуюць—
Ні узгоркі, ні лагчынкі.

25/VII 1913 г.

ДУБ.

Сілачом стаіць
Дуб разьвесісты,
І здалёк відаць
Пышны верх яго.

А ўнізе пад ім
Нёман коціцца,
Срэбрам-стужкаю
Павіваецца.

У нагах трава
Нізка клоніцца,
А вакол ляжыць
Травяністы луг.

Ў глыб зямлі вашлі
Карані яго;
Крэпка дуб стаіць,
Не парушыцца!

Так размашыста
Параскіданы
Ва ўсе стораны,
Лапы крэпкія!

Комель—слуп-скала,
Дыша сілаю,
А ўгару зірнеш—
Шапка валіцца!..

Дуж ты, дуб стары,
Сын вякоў сівых!
Многа бур ты зьнёс
На вяку сваім!

Налятаў віхор
З навальніцаю,
Ды ня гнуўся ты
Перад бураю!..

Гэй, ты, дуб стары,
Вартаўнік лугоў!
Аддае твой шум
Сьпевам-музыкай.

А пра што шуміш
І аб чым пяеш, —
Пра то ведаюць
Ветры вольныя,

Што з табой вядуць
Мову сталую
У летні добры час,
У восень смутную.

Я падслухаю
Гэты шум лістоў,
А з іх гутаркі
Песьня зложыцца.

22/VI 1910 г.

ПОКЛІЧ.

Гэй, чуеце, хлопцы? Дзе вы, скажэце?
Разьвеены ветрам па беламу сьвеце.

Па ўсіх вы куточках цішком распаўзьліся,
Ад думак даўнейшых сваіх адракліся;

Забылі вы песьні пра вольную волю,
Змаганьне за шчасьце і лепшую долю.

Адсьпевана песьня, бязсьледна прапала,
Бо хлеба скарынка язык завязала;

І нізка прыгнула вас першая бура—
Нешчасьліва ваша, эх, хлопцы, натура.

І тыя ярэмы, што вы асьмяялі,
Вы зноў-жа пакорна на шыі паклалі...

Ці чуеце, хлопцы?.. Адказу ня маю
І вечны вам покай ў вастрозе сьпяваю.

19/х 1909 г.

АРАТЫ.

— Но, малы! Но, малы, каб табе брыдка!—
Ў полі араты крычыць.
Сошка крывая дол рэжа плытка,
Толькі пясочак шарсьціць;

Глуха каменчыкі б'юць аб нарогі,
Папараць, пырнік, што крок.
З сіл выбіваецца конік убогі,
Зыдзе няўмысьля набок,—

Крыкне араты і торкне ляйчынай:
— Куды паўзеш ты? назад!—
Клыгае конічак зноў раўчавінай,
Тчэ за сабою ён склад.

Сам-жа араты сошку ўстрасае,
Мерна йдучы за канём.
Босыя ногі, а шапка старая,
Зрэбныя порткі на ём:

Грудзі расхлістаны, лушчыцца скура,
Пот залівае ўвесь тваар.
А неба ясьнютка і хоць бы дзе хмура!
Эх, данімае іх жар!

Клыгае конік, а ззаду араты,
Ходзіць сагнуўшысь, як склют...
Матка-зямелька! Эх, недарма ты
Корміш убогі свой люд!

19/хII 1909 г.

ПЯТРУСЬ-КАСЕЦЬ.

Шоў да дому Пётра з лугу,
Дзе ўвесь дзень касой вярнуў;
Па дарозе даў ён кругу,
Манапольку абагнуў.

Ўзяў кручок ён і рухава
Выбіў корак, губы ўцёр,
На кручок зірнуў ласкава,
Галаву падняў, замёр...

Палілась гарэлка ў жылах,
Як бы спраўнік там прайшоў,
І Пятрусь пачуўся ў сілах,
Закіпела яго кроў.

Сэрца ў грудзях так і б'ецца,
Лёгка—долу ня чуваць!
Так і рынуўся-б, здаецца,
Ён лявоніху скакаць.

Вось Пятрусь прыйшоў да дому.
Хмель яго забунтаваў:
Лёгка, весела старому—
Як бы зноў хлапцом ён стаў.

Глянуў ён—няма нікога;
Пад палок, на печ зірнуў,—
Як бы чорт залез ў старога:
Ступу к грудзям прыгарнуў

І пайшоў па хаце з ёю!
Тупнуў раз ён і другі,
Адбівае тахт нагою
І выпісвае кругі:

„Бадай таго кавэля
Мяцеліца замяла,
Як ён мяне маладу
Замарозіў на ляду!„

1911 г.

НА РАЗДАРОЖЖЫ.

Поы шляху шырокім,
Дзе стаіць камора,
Я на сьвет радзіўся
Пад глухі шум бору,
Позна,ю парою,
Восеньню гнілою.

Па шляху тым бітым
І удзень і ўночы
Пешкі і з вазамі
Валіць люд рабочы,
Як яго хто гоніць,
Ажна шлях гамоніць.

У розныя старонкі
Каля тэй каморы
Распаўзьлісь дарожак
Шэрыя узоры.—
Вузкія, глухія
Сьцежачкі крывыя.

І мая, бы восень,
Доля невясёла,
І куды ні гляну—
Глуха навакола,
Смутна аддаленьне,
Хмызьнякі, каменьні...

І мяне людзкая
Хваля падхапіла
І у глыбокім віры
Моцна закруціла
І нясе з сабою
Цяжкаю ступою.

Толькі-ж не па шляху
Носяць мяне ногі,—
Вузкі мае сьцежкі,

Зарасьлі дарогі.
Я іду-дыбаю.
А куды? ня знаю!

2/I 1911 г.

У ДАРОГУ!

Зложаны у клунак
Ўсе мае прылады...
Гайда ў пуць-дарожку,
Гайда між прысады!

Вітаю дарогай,
Вольнаю трапою
Ў Божы сьвет шырокі
Мерною ступою!

Ужо мяне чакае,
У доўгі пуць гатовы,
Мой таварыш верны,
Сябар-кій дубовы.

Ў нашым родным лесе
Вырас ён са мною,
Вырас, ўзгадаваўся
Хмураю вясною;

На блуканьне-гора
Бог судзіў, няйначай,
І злучыў ён долю
З доляю бядачай.

Шкода мне вас кідаць,
Родныя пагоркі!
Ужо няскора ўчую
Згоднае гаворкі

Ветрыка ў садочку
З вішняю зялёнай,
І ня ўловіць вуха
Шопату загонаў.

Я няскора ўбачу
Родныя курганы,
Што задумай ціхай
Лёгенька затканы

І глядзяць маркотна.
Як сіроты-дзеці:
Цяжка адзінокім,
Знаць, і ім на сьвеце.

Эх, вы, нівы-гоні!
Вы мяне ўскармілі
І любасьць у сэрца
Моцна залажылі

К гэтым шэрым хатам,
К гэтым бедным сёлам,
К белым хмаркам ў небе
Над зялёным долам,

К сьветлым рэчкам-стужкам,
К срэбраным крыніцам...
Не з дабра-ж іду я
К людзям чужаніцам.

Ой, ёсьць цемень-сіла
Злосная, ліхая,
Што і любасьць тую
Гоніць, разлучае.

Толькі-ж дзе ні буду,
З доляй ці няволяй,
Не забыць цябе мне,
Роднае, ніколі!

З цяжкім смуткам ў сэрцы
Я вас пакідаю,
Мілыя малюнкі
Дарагога краю!..

Зложаны у клунак
Ўсе мае прылады.

Гайда ў пуць-дарогу,
Гайда між прысады!

Ўжо мяне чакае,
Ў доўгі пуць гатовы,
Мой таварыш верны,
Сябар-кій дубовы.

24/v 1912 г.

* * *

Зноў павсела турмою,
Згасьлі ў сумраку агні,
І гаротнай чарадою
Нудна цягнуцца нам дні.

Зноў ашарпаныя сьцены,
Зьвяга цяжкіх ланцугоў,
І няма ніякай зьмены
Ў гэтым холадзе муроў.

Ды няхай тут плача доля
Бяз уцехі і надзей:
Тым даражэй будзе воля,
Час сьвітаньня весялей.

5/vii 1910 г.

У ДАРОЗЕ.

Поле бяз берага, шыр несканчоная,
Даль неглядная, даль засмучоная,
Смугай спавіта ўся ты!

Што пазіраеш ты з немай трывогаю?
Што расьцілаеш туман над дарогаю,
Ставіш упын мне круты?

Што ты вядзеш мяне нетраю-пушчаю,
Вузкаю сьцежкай, крывой, нявідушчаю,
Сьцелеш што крок, то лагі?

Што насыпаеш капцы мне пяшчаныя,
Густа каменьнямі ўсюды усланыя?
Дзе-ж іх канец, берагі?

Дзе-ж мая хата? Дзе нівы шумлівыя?
Гоні шырокія, пожні шчасьлівыя?
Дзе яны? Хто іх пабраў?

Дзе лугавіна, травою акрытая?
Дзе маё поле, сьлязьмі ўсё аблітае?
Чый яго плуг паараў?

Лес мне гуторыць, шуміць верхавінамі:
«Хвоі на хату пасохлі націнамі.
Будзеш бяз дому ты век».

А поле мне шэпча: „Ветры свабодныя
Гналі над нівамі хмары нягодныя —
Град тваю ніву пасек;

Доўгія гоні твае папустошаны,
Твае сенакосы чужымі пакошаны
І сам чужаніца ты ім"...

Што-ж мне варочацца? Далей узгоркамі
Ў даль невядомую, з думкамі горкімі,
З горам і з смуткам маім!

9/III 1912 г.

* * *

Я хачу аб табе
З кім хоць слоўка сказаць,
Сэрца тугу, жуду
І сумненьні прагнаць.

Але толькі ж няма
З кім мне сум падзяліць,
І я мушу адзін
Ўсё пражыць, перабыць.

19/VII 1914 году.

ДАРОГА.

Між сьпелага жыта
Сінее валошка,
Бяжыць паміж нівак
Крывая дарожка.

Скажы мне, дарога,
Хто езьдзіць табою?
Куды ты крывенькай
Бяжыш паласою?

Па ўзгорках высокіх,
Багатых пяскамі,
Даўно пралягла ты
Двама паяскамі.

Скажы мне, дарога,
Чаму ты крывая
І вузка і цесна,
Як доля людзкая?

Бяжыш ты часамі
Праз горы, курганы.
Чыёю рукою
Крыжы пастаўляны?
Знаць, гора-нядоля
Тут сьлед пакідае...
Маўчыць, не гаворыць
Дарожка крывая.

І бедныя людзі
Тут езьдзяць і ходзяць,
А шчасьця і долі
Ніяк не знаходзяць.

12 IX 1909 г.

ГАДАВІНА.

Лінуць дождждык памыкаўся,
Вецер ліст сухі ганяў;

Нешчасьлівы дзень прыдаўся:
Ў той дзень волю я хаваў.

Сам я йшоў бядзе у рукі,
Сам я вольнасьць сваю нёс
Ў гэты суд, балота мукі,
Ў гэту багну гора, сьлёз;

Ў суд, дзе праўда ўжо спрадвеку
Папіхаецца нагой,
Дзе прастор вялікі зьдзеку
Над бяздольнасьцю людзкой.

Я дабра не спадзяваўся,
Я там праўды не чакаў...
Нешчасьлівы дзень прыдаўся:
Ў той дзень волю пахаваў.

15/ıx 1909 г.

НА КРЫЖОВЫХ ДАРОГАХ.

На пагорку ў чыстым полі
Крыж стаіць убогі.
Тут і там жаўцеюць ролі.
Ў сьвет бягуць дарогі.
Тая ўежджана і ўбіта
Крэпка капытамі,
А другія йдуць скрозь жыта
Цьмянымі сьлядамі
І зьнікаюць прападаюць
Дзесь-та за гарою,
Зноў з-пад гаю выбягаюць
Стужкаю крывою.
І раскрылась даль шырока
З гэтага узгорку.
Ціха ў полі, адзінока,
Штось на сэрцы горка.
Я стаю і аглядаю
Горак рад убогі;

А куды мне йсьці—ня знаю.
Не ўлаўлю дарогі.
І блукаюсь я ад раньня.
Усё дарог шукаю.
І на ўсе свае жаданьні
Вотксліку ня маю.

12-II 1921 г.

КРЫЖ.

На стыку трох дарог пры полі,
Дзе пачынаецца сяло.
Стаіць святы адзнак нядолі,
Схіліўшы пахмурна чало.

Павязка стлела і спаўзае,
А крыж асунуўся на плот,
Як бы ён горача жадае
З нядолі вызваліць народ.

Няхай-жа гэты знак пакуты.
Калі рассыплецца ён ў прах,
Навекі зьніме тыя путы,
Што накаваў крывавы жах.

17 ІХ 1921 г.

НА ПРАСТОР.

Гэй, на волю, на разлогі
Ціхіх даляў і палёў,
Дзе ва ўсе канцы сьвятоў
Леглі вольныя дарогі;

Дзе бяз хітрыкаў, праўдзіва
Колас гутарку вядзе,
І дзе дуб стары гудзе
Ня лісьліва і фальшыва.

А сваёй старой гудою,
Як Бог ў душу палажыў,

I дзе ўсю красу раскрыў
Луг шырокі над ракою!

Гэй, туды, дзе неба з долам
Абняліся, як браты, —
Хоць на міг забудзеш ты
Гэтай фальшы нудны шолам!

1914 г.

* * *

Усьміхнулась, праясьнілась
Глыб бяздонных нябясоў,
Ясным сонцам асьвяцілась,
Ў тканку тонкую акрылась
Чуць-чуць значных ваблакоў;

Як прад шлюбам маладая,
Паднядзелілась яна
І на землю пазірае,
Ўсюды жыцьце выклікае,
Ціхай радасьці паўна.

А з зямлі ёй на спатканьне
Песьні жаваранкі шлюць
Ад усходу да зьмярканьня,
І лясы ёй ў прывітаньне
Верхавінамі гудуць.

1914 г.

МАРАВА.

Шоў дарожны адзінока.
Поле голае шырока
Гладзьдзю роўнаю лягло.

Ні дзярэўца, ні кусточка;
Апроч жоўтага пясочку
Нічагутка ня было.

Сонца варэм аблівала
І бяз жалю апаляла
Грудзі цьвёрдыя зямлі.

Уміраў бядак ад смагі,
А па твары поту рагі
За каўнер яму цякло.

Пуста, ціха і маркотна...
Кідаў вочы ён гаротна,
Ці ня блісьне дзе вада.

За далёкай сіняй граньню
Мельканула гожай зданьню
Пышных росьлін чарада.

Падарожны ажывіўся.
Блеск надзеі засьвяціўся
У яго стомленых вачах.

І цьвярдзей ступаюць ногі;
Цяжкасьць труднае дарогі,
Сьпёка, вар яму ня страх.

А дзярэўцы усё здалёка
Так і цягнуць яго вока,
У цянёк яны завуць.

Падарожнаму здаецца,
Што крыніца там ліецца,
Хвалі ў радасьці пяюць.

Вось бліжэй, бліжэй расьліны;
Купы лозак і каліны
Акружаюць беражок;

А з зялёненькіх галінак,
З розных красак і травінак
Гожы сплецены вянок.


Скрозь лісточкі і галінкі
Улоньне ямы-азярынкі
Прасьвячае дзе-ня-дзе;

Ды з яе шоў пах нядобры,
А на дне тырчачі робры
Нейкай падалі. У нудзе

Галавой панік дарожны.
Вар паўднёвы, жар бязбожны
Горай стаў яго сьпякаць...

Тая-ж трудная дарога
Між пяскоў ідзе убога.
Тая-ж вымершая гладзь.

30 XII 1910 г.



УСПАМІНЫ.

Вобраз мілы, поўны чараў,
Маладой вясенькі мараў,
Гожа з прошласьці ўстае.

І з чароўнай нейкай сілай
Мігатнецца казкай мілай,
У сэрцы радасьцю снуе...

Ой, вы, сьветлыя ўспаміны
Аб дзянькох маіх дзяціных,
Перабытых часаў ніць!

Ой, вяліка ваша ўлада!
Вамі сэрца поўна, рада,
З вамі люба гаманіць.

Мо' за тым і жывяцё вы,
Каб разьвееньць сум жыцьцёвы,
Жальбу, тугу адагнаць?

Вобраз мілы і далёкі
Кінуў ў сэрцы сьлед глыбокі,
Ціхай жаласьці пячаць;

І цяпер скрозь змрок халодны
Ўстане гэты вобраз родны,
Шчасьцем душу ўскалыхне,

Потым смуткам адгукнецца,
Ціхім жалем пранясецца
І патоне ў глыбіне.

²⁄ᵥₗₗ 1915 г.

ВЫСОКІ БЕРАГ.

Высокі Бераг, родны, мілы!
Люблю я твой пяшчаны скат
І хвоек нізкіх гурт пахілы,
Капцоў гранічных цэлы рад.

Люблю той лес, што над табою
Высока ўзьняў свае камлі.
Зьвілісь карэньні над вадою,
Як бы вянок табе сплялі..

Бруіцца Нёман мелкаводны
Ў тваіх прыўдалых берагох,
А ў лозах ветрык вее згодны,
І ходзіць шолах ў чаратох.

Высокі Бераг, кут мой мілы!
Люблю я жоўць тваіх пяскоў,
Разложных хвоек гурт пахілы
І ціхі гоман лазьнякоў.

3. VIII 1915 г.

ТРОЙКА.

Коні скачуць. Дзын-дзын дзын!
Гучна звон нясецца
І далёка між раўнін
Ціхім жалем льецца.

Ціхне, глухне гэты звон,
Ўскочыўшы ў гаёчак,
Ўсё слабее, ціхне ён,
Кволы галасочак...

Вось і тройкі ня відаць,
Праняслась стралою,
І званочка ня чуваць
Плачу пад дугою:

Толькі пыл трубой курыць
Над дарогай бітай;

Поле ціхае глядзіць
Сіратой забытай.

І пытае ціш яго
Поглядам, здаецца:
Хто праехаў і чаго
І куды нясецца?

І ня будзе знаць, стралой
Куды тройка скача,
І званочак пад дугой
Чаго ціха плача.

9/VI 1910 г.

НА ПЕРАЛОМЕ.

Дні бягуць ды бягуць.
Вянуць краскі ў палёх.
Жоўкнуць лісьці, трава,
Моўкне сьпеў па лясох.

І часьцей, ўсё часьцей
Хмурыць неба свой твар;
Рэдка сонца глядзіць
З-за туману і хмар.

Азірнешся вакол —
Глуш. маркота і ціш.
І з нудою на ўсё,
З горкім сэрцам глядзіш...

Сам ня знаеш. чаго
Цябе жаль спанаваў,
Як бы часьць сам сябе
Ты навек пахаваў.

Дні праходзяць, бягуць,
Карацеюць яны;
З кожным днём далей мы
Ад жыцьця, ад вясны.

19 VII 1910 г.

ДЗЬВЕ ДАРОГІ.

Над балотам, над лясамі
Жураўлі крычаць,
Бы сваімі галасамі
Хочуць вестку даць,

Што цяпло мінецца скора
І заглухне бор,
У полі сіняга прастору
Ня угледзіш зор;

Што нагоніць хмар вятруга,
Наплыве туман,
І абніме гора - туга
Поле, лес, курган...

Разам з вамі, вольны вырай,
Палячу і я.
Толькі-ж к сьмерці стане бліжай
Сьцежка там мая.

Ляціцё вы ў край паўднёвы
Зіму пераждаць,
Каб на весну песьняй новай
Родны кут вітаць.
А я еду, госьці лета,
У той крывавы вір,
Дзе вар'яцтва ўсяго сьвету
Свой спраўляе пір.

22 VII 1917 г.

НА РЭЧЦЫ.

У бераг высокі, дзе лозы растуць,
За хвалямі хвалі бягуць,

І ўсхліпвае рэчка ў пяскох залатых,
Як маці па дзецях сваіх,

І ў беразе вербы злучаюць свой сум
У гэты нярадасны шум:

І неба маркотна, і хмары плывуць,
Іх сьлёзы на землю цякуць...

Прыбіты вадою на срэбраны гак,
Ляжыць невядомы бядак,

Ваяка-салдацік, ад дому ўдалі...
Яму не знайшлося зямлі!

Эх, ты, небарака! То, знаць, па табе
Ўсё вецер сумуе ў вярбе.

І рэчка у хвалях - жалобе бяжыць,
І неба праз сьлёзы глядзіць.

Ды рэчка заціхне, і вецер засьне,
І ласкаю неба зірне,

І ўсё спачыне, спазнае час свой,
А людзям ці будзе спакой?

20/VIII 1916 г.

ПОЛЕ.

Зарасьлі вы, межы, ў полі
Дзікім зельлем палыном;
Гаспадар на вас паволі
Раніцой ня йдзе з канём...

Не хапіла сіл жаночых
Глыбей землю заараць,
На загончыках сірочых
Травы сталі красаваць.

Вось і трэцьце даў Бог лета,
А няма гаспадароў,
Ня чутно цяпер дасьвету,
Як даўней, іх галасоў.

Дзе-ж падзелісь вы, сяляне?
Што нідзе вас ня чуваць?...
Ды баяцца на пытаньне
Межы свой адказ даваць

I сіроткай глядзіць поле,
Смутна ўдаль бягуць шнуры
І ня кажуць, што за доля,
І дзе іх гаспадары.

27/VIII 1916 г.

ВОРАГАМ.

За што лілася кроў людзкая?
За што гібеў і гінуў люд?
Гібеў набытак ўсяго краю,
І пакаленьняў гінуў труд?

І бег народ, як ў час паморку,
Закрыўшы вочы, ў Божы сьвет,
І толькі дым ўздымаўся горкі,
І крыж адзначываў іх сьлед.

А колькі сьмертак дзетак мілых
На вашай совесьці ляжыць?
Пануе ціш на іх магілах,
І край разбураны маўчыць.

І вы цяпер рукамі ката
Гатовы згоду „дараваць",
Але ці можна у вас брата,
Скажэце, Каіны, прызнаць?!

Вам не па сіле груз цяжэрны
Вайны, што самі вы ўзьнялі;
Яе пажар і мах бязьмерны,
Згінота цяжкая зямлі!

Ня вы дасьцё народам сьвята,
Ня вам пажар вайны заліць.
Прэч вашы рукі, збойцы, каты —
Ня вам аб згодзе гаварыць!

2/XII 1916 г.

* *
*

Люд стогне, гаруе пад цежарам меча,
Скаваў яго сэрца гарачае лёд.

Адкрыты дарогі табе, чалавеча,
На поўдзень, на захад, на ўсход.

Ты вольны, нябога, ідзі, куды хочаш.
Я даў табе сілы ярэмы пабіць,
Даў чуткія вушы, арліныя вочы,
Я даў табе душу і сэрца любіць.

Вы-ж зьбіліся з дарогі, вас ноч ахапіла,
Арліныя вочы патухлі у вас,
І водзіць вас ў полі нячыстая сіла,
Агонь ў вашым сэрцы пагас.

Аб чым-жа сумуеш, бядак неспакойны?
Акінь сваім вокам прыгожую даль.
Ахамяніся, будзь сын мой дастойны,
І радасьцю пазнаеш, адкінеш свой жаль.

27/VIII 1917 г.

НЕЎСПАГАДНАСЦЬ.

Слаўся дым па тых прасторах,
Дзе лятали няжывыя
Людзі-брацьці, для каторых
Учынілі баль ліхія.

Сьмерць вар'яцтва тут рабіла
Над людзьмі і над зямлёю.
Злых пачаткаў цьмішча-сіла
Перайшла па ёй з касою.

Ўвесь пабіты, лес валяўся —
Ўзмах вайны ўсё нішчыць. глушыць
Ў неба гэты дым ўзьнімаўся,
Каб яго спакой парушыць.

Але ціхі, неўспагадны
Сініх высяў шыр - прасторы,
І скрозь наміткі ядвабны
Белых хмар сьмяяліся зоры.

10/IX 1916 г.

ДУМКІ ЖАЎНЕРА.

Разлучыўся жаўнер з сваёй роднай сямьёй,
Разьвітаўся ён з домам сваім.
Знае лес баравы, дзе дыбаў ён ступой,
Што за думкі віліся над ім.

Замірала душа, млела сэрца яго,
І туманілісь вочы сьлязьмі.
Кінуў жонку адну і дзяцей... на каго?..
Хоць ты з жалю разьбіся, вазьмі,

Развâжае бядак, дом ня йдзе з галавы,
Пахілілась на грудзі яна.
І, здавалася, з ім плакаў лес баравы,
Быццам думка была ў іх адна.

Ў невядомай далі ты дажджэшся чаго?
Прападзеш ў чужыне, як ня жыў,
І ня скажа ніхто, дзе магіла яго,
Дзе ён косьці свае палажыў.

Скрозь прагалін лясоў былі хмаркі відны,
Ў сінім небе іх нікла руно,
І, здавалася, з ім смуткавалі яны,
Як бы гора было ў іх адно.

Эх, за што, ну, за што, адкажэце вы мне,
Я павінен другіх зьніштажаць?
Ці калечыць сябе ў гэтай дзікай вайне
І пад кулі свой лоб падстаўляць?

Вы, што селі ўгоры, як вас, каты, назваць?
Не шкада вам нявінных людцоў;
Самадурства сваё вы гатовы купляць
Міліёнамі нашых галоў.

25/VII 1916 г.

НЯ ДАМСЯ!

Вось мяне і пасадзілі,
Каб сялян не бунтаваў;
Мяне білі і судзілі,
Па вучастках валачылі,
А цяпер сюды папаў.

Што ж, Язэбка! Чысьць куточкі,
Блага—ўсюды многа цьмы...
Ды ня думайце, паночкі,
Што спужаўся я турмы!

Хоць каму, а жыць тут трэба,
Каб астрог не пуставаў.
Доля выбрала Язэба —
Жуй, Язэб, скарынку хлеба,
Покі Гурка не раскраў;

Жуй, хоць плачуць твае вочкі —
І да сьлёз прывычны мы...
Ой, ня думайце, паночкі,
Што спалохаўся турмы!

Праўда, жыць тут не салодка:
Харч—сьвіначы лепшы стол,
Пухне пуза, як калодка,
Але голад, брат, ня цётка:
Ем бурду їх, як той вол.

Што ж, Язэбка: гора змальства,
Беднасьць гнала да сумы...
Эх, ня радуйся, начальства:
Не зьлякаўся я турмы!

Ось адбуду тэрмін гэты,
Выйду я на сьвет з муроў,
Зноў за кніжкі, за газэты...
Вось вам, плешкі-апалеты:
Не баюся я шнуроў!..

Хоць навіслі ґуста хмары,
Хоць на змор мяне бяруць. —
Не! мяне ня справяць кары,
Толькі злосьці паддадуць!

3/II 1909 г.

НОЧ У ВАСТРОЗЕ.

Ноч глухая. Ціха.
Ґуста лёгла цьма.
Дрэмле назірачы,
Цяжка сьпіць турма.

Страшнай зяўрай зьмея
Карыдор глядзіць.
І тужліва лямпа
Сьвеціцца, дрыжыць.

Обак карыдору
Камары відны,
Пад замкамі дзьверы,
З кратамі яны.

І здаецца, сьцены
Ціснуцца цяжэй,
Гнуць яны і душаць
Усё мацней, мацней...

Нудна, як ў магіле,
Глуха, як ў труне;
Толькі часам крыкне
Арыштант у сьне.

Мо' Кабека*) здасца,
Спраўніка сасьніць,
Ды „параша“ зрэдка
Гучна загрыміць.

20/х 1908 г.

---

*) Старшыня Віленскай Судовае Палаты.

* * *

Сьціхнуў шум на карыдоры,
Ня чутно гаворкі,
На замок запёрты крэпка
Цесныя каморкі.

Ня зьвіняць жалезным звонам
Цяжкія кайданы...
Злосна, дзіка пазірае
Гэты дом паганы!

Шчыльна целам чалавечым
Сплош укрыты „нары“.
Ціснуць грудзі арыштантам,
Томяць, бедных, мары.

Сон трывожны ў сьпёртым дусе
Не дае пакою...
Эх, як марне прападае
Жыцьце маладое!

Сьвеціць лямпа нудным блескам,
А вакол ціхутка!
Праз рашотку не спаткаеш
Вокам нічэгутка.

Ласьне сьвет убачыш бледны,
Як ліхтар мігае,
Ды за вуглам вецер вольны
Песьню засьпявае.

2/XII 1908 г.

СЬМЕРЦЬ АРЫШТАНТА.

Праз вастрожны двор закрыты
Два людцы маўчком ідуць,
З тоўстых дошак, сьпешна зьбіты,
Цесны гроб яны нясуць.

Ў звон ня звоняць, не сьпяваюць,
Нікагутка ня відно;

Два плячы той гроб трымаюць,
Як якое бервяно.

Арыштант! Сярод дарогі
Сам сябе ты адзвеніў:
Кайданамі твае ногі
Суд «ласкавы» адарыў!

Арыштант! Яшчэ ты ўчора
Сам сябе і адмаліў.
Ў гроб хвеёвы сваё гора
Ты глыбока палажыў.

Арыштант! І ў роднай хаце
Жыць з сямьёю не далі,
Месца й там табе ня хваціць,
Як ня стала ня зямлі.

А сканаў ты, як сабака.
Знаць ня будуць сваякі,
Як пражыў ты, небарака,
Тры апошнія дзянькі.

Арыштант! Цябе зарыюць,
Не заплачуць над табой,
Хіба мо' ваўкі завыюць
У піліпаўкі зімой.

Арыштант! Твае магілы
Крыж ня будзе вартаваць,
Адзін вецер свае крылы
Над ёй будзе разьнімаць,

Калі ўвосень раззлуецца
І памчыцца ў сьвет гуляць.
З языка ня раз сарвецца:
«Хтось павесіўся, відаць».

І ня будуць ведаць дзеткі,
Дзе іх татка апачыў:
Няма нават і заметкі,
Дзе ты костачкі злажыў.

21/I 1909 г.

ВЯСНОЮ.

Вакол ўсе вясёлы, снуюць і гамоняць,
Відаць—і ў іх сэрцы вясна,
І горкія думкі галоў іх ня клоняць,
Ім доля прыхільна, красна.

Шаны куску хлеба ня знаюць шчасьліўцы,
І галава іх аб тым не баліць,
Як будзе багатая пожня на ніўцы,
Як заўтрашні дзень перабыць;

Ці будзе прытулак зьвярэджаным плечкам,
І ногі куды занясуць
Іх цела худое: ці к мору, ці к рэчкам,
І рукі каму прададуць,

Свабодныя рукі з патрэсканай скурай.
Шчасьлівец ня знае таго,
Як гнецца галеча прад чорнаю бурай
Няўдалага жыцьця свайго.

А хто гэта ходзіць адзін стараною?
Чаму вы ня рады яму?
Чаму ён ня з вамі? Чаму галавою
Так нізка панік ён? Чаму?

Шчасьлівыя людзі, як хвалі, што ў моры:
Іх вецер узьніме—бягуць,
І то, што лізалі, ласкаючысь, ўчора,
Пры ветры другім аплююць.

7/III 1912 г.

* *
*

Ня дай, Божа, сэрцам зьнікнуць
І душой апасьці,
Страціць веру і надзею
На жыцьцё і шчасьце:

Бо бяз веры і надзеі
Ў сьвеце ўсё пастыла,
Бо, згубіўшы сэрца крэпасьць,
Чалавек—магіла.

20/viii

НЕБА.

Зоркі таемныя, зоркі далёкія
Ціха мігаюць, дрыжаць.
Тонкія хмарачкі, лёгкакрылатыя
Белым абрусам ляжаць.

Скрозь іх валоканцы, рунь беласьнежную,
Сьвеціцца глыб небясоў...
Эх, як спакойна ты, неба бяздоннае,
Царства далёкіх сьвятоў!

Эх, як прыгожа ты, высь неаглядная,
Цёмная, сіняя гладзь!
Як сьвечачкі, зоркі на Божым аўтарыку
Кожную ночку гарадь.

Эх, колькі прастору, эх, колькі раздольля!
Колькі таго хараства!
Што-ж нам нявесела, людзі мы Божыя?
Што-ж нам баліць галава?

Ночачка цёмная, ночачка зорная,
Ціш неабудная, цьма!
Волячка сьветлая, дзе ты, жаданая?
Волі няма нам, і шчасьця няма!

8/ix 1909 г.

СЯБРУ.

Эх, як бедна у нас!
Эх, вялікая глуш!
Брат! Працуй, не чакай,
Цьму людзкую ты зруш!

Восень, доўгая ноч
Над народам вісіць!
З кожнай хаты нуда,
Недастача глядзіць;

З кожнай грудзі людзкой
Хоча вырвацца крык,
Енк балючай душы
Бедакоў-гарамык.

Вочы, поўныя дум,
Ўдол маўкліва глядзяць,
Іх надзеі там ўсе
Ўжо спрадвеку ляжаць.

Раскатурхай народ,
Сьвет яму разьвяжы
І за долю яго
Працу ўсю прылажы!

10/ix 1909 г.

РОДНЫЯ МАЛЮНКІ.

Бітыя дарогі,
Цьмяныя пуціны,
Вольныя разлогі,
Ўзгоркі і даліны...

Белыя бярозы,
Пышныя таполі,
На балотах лозы,
Вербы сярод поля...

Рэчкі і азёры,
Мурагі, чароты,
Ціхія прасторы,
Лес, гаі, балоты...

Вас не пералічыш,
Не акінеш вокам,
Голасам ня склічаш,
Вас ня зьмерыш крокам!

Ды ляглі над краем
Хмары-навальніцы,
Рубяжоў няма ім,
Ім няма граніцы!

Выйдзеш ты ў дарогу,
Даль цябе жахае
І малітвы Богу
Ў сэрцы выклікае.

Ёсьць у гэтай далі
Хараство і чары;
Ўзьнімуць цябе хвалі,
Засьміяюцца мары.
Ты ідзеш, бажаеш,
Повен ты надзеі,
Ды не прачуваеш,
Дзе твае зладзеі.

Наплывуць туманы
Горкае нядолі,
І куюць кайданы
Цяжкае няволі.

Ты ідзеш скрозь церні,
Ўперадзі—каменьні,
Сееш праўды зоркі,
Разьбіваеш зьвеньні

Ланцуга ліхога,
Скованага злымі.
Цяжкая дарога:
Ты апутан імі!

Радасьць ты пачуеш,
Як ланцуг парвецца,
Ды ты зноў гаруеш —
Зноў зьвяно ўпляцецца

Ў шнур агідлы гора,
Што канца ня мае,

І цяпер, як ўчора,
Сэрца смутак знае.

Кавалі другія,
А ланцуг той самы —
Песьні ўсё старыя
Неаджытай гамы.

20/VIII 1921 г.

У ПАЛЁХ БЕЛАРУСІ.

Дзень добры вам, лясы і далі,
Прасторы ціхія зямлі!
Я зноў срэдзь вас, пагоркі-хвалі,
Палоскі цьмянае ральлі!

Вітаю вас, як блізкіх, родных,
Старыя хвоі на палёх.
І вас, красёнцы сьцежак згодных,
Сьляды нялічаных дарог!

І гэты жоўценькі пясочак,
Дзе хвойкі зелена растуць,
Бярозы тыя, што ў шнурочак
За рубяжы зямлі бягуць;

Ўдоўж рэчкі гэты луг мурагжны,
Дубоў разьвіслых цэлы рад
І буслаў дом, стары, заможны,
Як той пасэсарскі пасад.

То тут, то там лясок сінее,
Ў лагчынах рэчачкі блішчаць,
Ад усюль пакоем Божым вее,
На ўсім адна ляжыць пячаць —

Развагі ціхай, задуменьня
І нейкай смутнае красы,
І чуеш ў гэтым лятуценьні
Адвечнай песьні галасы.

А хмарка ў небе, ў Божым полі,
Плыве шчасьліва, як дзіця,
І забываеш мімаволі
Ўвесь клопат буднага жыцьця.

Куды ні гляне маё вока, —
Усё поўна згоды, дабраты...
Ты маеш выгляды прарока,
Наш край пакуты, край сьвяты!

1921 г.

ЗВОН ШЫБАЎ.

Ноч маўкліва. Цёмна, глуха.
Прылажыла чутка вуха
За вакном старая вішня,
Штось прамовіць: шу шу шу!
І заціхне, бы баіцца
Памыліцца
І сказаць што-небудзь лішне.
Я лажусь, агонь тушу.

Неба хмура, няпрыветна;
Зрэдка ветрык чуць п[illegible]
Скулься ціха набягае
І галінкі згайдане
І зьнікае ці дзесь палей
Бяжыць хваляй,
Байку-тайнасьць ціха бае
Анямелай цішыне.

Ў хаце ціха, нават жудка.
Ловіць зыкі вуха пудка:
Звоніць шыбка штось жалобна —
Дррон-дррон! ціха бразгаціць
Чуць счакаўшы, новым звонам,
Нізшым тонам
Так-жа нудна, такжа дробна
Шыбка новая зьвініць.

Няма ветру, ўсюды ціха:
Шыбы-ж звоняць—што за ліха?
Хто ў іх стукнуў? Хто чапае?
Ці то знак хто хоча даць,
Што згубілі мы дарогу,
Б'е трывогу,
Ходзіць, ўсіх прасьцярагае
І накладвае пячаць

На шляхі, дарогі тыя,
Дзе крыжы згнілі старыя,
Ці зумыслу пазьнімалі,
Як аджыўшыя свой час.
Хто такі ён? Невядомы,
Незнаёмы,
А мо' дзе і сустракалі,
Мо' з ім бачылісь ня раз.

І так сьцішна, чагось смутна,
Ўсё сьпявае шкло пакутна;
Толькі-ж думка не згадае,
Што гуторыць гэты сьпеў,
І ня хоча супыніцца,
Пагадзіцца
З тым, што сэнсу ня ўчытае:
Ці то жалаба, ці гнеў?

Шыбы звоняць і сьпяваюць,
Песьню скончаць, зачынаюць,
То павысяць яны голас,
То замлеюць, то замруць.
Жаль ў іх песьні сэрца чуе
І гаруе,
Шклечка-ж звоніць ўсё раз-по-раз,
Не дае ўсё мне заснуць.

1921 г.

ЦЕНІ-СТРАХІ.

Вечар блізка, жар спадае.
З цёмных шчылін хтось нязнаны
Цені-страхі выклікае,
Штось ім шэпча, штоськівае,
Ды таемна, няўчытана.

Сьмех вясёлы зьбег няждана
З таго лесу і пагорку,
З тых лагчынак і з кургану,
Смуткам поле чуць заткана,
Смутак ходзіць панадворку.

Пуцявінкай праз разорку
Скача мышка палахліва
І шукае сваю норку
На мяжы каля аторку
І зьнікае дзесь маўкліва.

Я іду, гляджу і—дзіва,
Ці раней таго ня бачыў?
Ўсюды стала нейк пужліва
І трывожна-баязьліва!
Зьмену гэту я зазначыў.

Хто-ж выраз той перайначыў?
Я ня сьцямлю і пытаю,
Ды пытаньнем азадачыў
Ўсіх, каго я тут ні бачыў,
Ўсіх, каго ні спатыкаю.

— Чапля! чапля! стой!—гукаю:
Ты ня ведаеш, скажы ты,
Ці я сам страхі шукаю,
Сам іх вобразы ствараю,
Ці тым страхам ўсе спавіты?

— Ня пытайся: я ня знаю! —
Тры вароны ляцяць з гаю.
Цяжка крыльлі іх мігаюць.

— Гэй, спынецесь! справу маю:
Штось у вас я запытаю... —

— Мы ня знаем!.. Не, ня знаю! —
Закрычалі і зьнікаюць.
Насустрэч старцы дыбаюць.
— Скуль вы людзі? хто такія? —
Воч старцы не падымаюць.
Усе маўклівы, разважаюць:
— Мы—сьляпыя! мы—глухія! —

Цені сталі больш густыя,
Многалучны, нясчысьлёны,
Многазначны, хоць пустыя,
Вельмі страшны, бо нямыя,
Пад пячацьцю ўсе замкнёны.

Лес, папары і загоны
Твар выразны свой хаваюць.
Дзесь далёка стогнуць звоны,
Дзесь у лесе плач шалёны—
Совы дзень свой зачынаюць.

Цені-страхі выпаўзаюць,
Іх ня бачыш, прачуваеш,
Штось чаруюць, заклінаюць
І таемна пагражаюць,—
Чым? У тым сіла, што ня знаеш.

25/IX 1921 г.

ПОКЛІЧ.

Гэй, чулыя сэрцам! Гэй, душы жывыя!
Ідзеце вы долю шукаць!
Ёсьць у вас сілы, яшчэ маладыя,
Ёсьць яшчэ крыльлі лятаць!

Але ўважайце: балотная бросьня
Іх кожную хвілю сачыць,
А гнільлю зацягне, душа не уваскросьне
Ўгару над зямлёй не ўзьляціць.

Вы чуеце хваляў жывых набяганьне?
Прыгледзьцеся: новыя дні
На вас пазіраюць у іскрах сьвітаньня,
І сьвецяць другія агні.

Сьпяшайцеся, брацьці, расою халоднай
Ваш твар выразьлівы абмыць
І воздух гаючы палёў, нівы роднай
У грудзі чым больш захапіць.

Але памятайце: на вашым суменьні
Ня сплачаны доўг векавы:
То доўг прад народам, то доўг разуменьня,
Якое зачэрпалі вы:

З народнага скарбу душы самабытнай
І з скарбу яго мазалёў.
То ён, працавік наш, то ён, старажытны,
На гору нас моўчкі узьвёў.

Гадуе вас поле, што золатам зьяе...
Пяскоў, нераджайных пяскоў;
Вас корміць сярмяга, што долі ня знае,
Ня ведае ласкі братоў.

Ідзеце-ж к народу, як добрыя дзеці,
Ідзеце. Злучайце яго.
І горкую праўду у вочы скажаце,
Чаго ён гаруе, чаго?

11/VI 1921 г.

БЕЛАРУСКАМУ ЛЮДУ.

Змоўкні ты, сьціхні, песьня пакуты,
Заварушыся, наш край!
Люд беларускі! Рві свае путы!
Новую песьню сьпявай!

Дружна, згодна станьма сьцяною,
Доля ня прыдзе сама,
Воля ня зойдзе к нам стараною,
Збоку дарог ёй няма.

Люд! Праканайся: толькі мы самі—
Долі свае кавалі.
Годзі жа, досыць панукаць намі,
Гнаць з нашай роднай зямлі!

Нам паганятых болей ня трэба—
Будзем мы жыць без паноў.
Самі вы дбайце лепей пра неба!—
Скажам мы так да ксяндзоў.

Хіба забудзем мы тыя межы,
Што правадзілі бяз нас?
Раны глыбокі, ох, яшчэ сьвежы!
Помсты агонь не пагас.

Нас падзялялі—хто? Чужаніцы,
Цёмных дарог махляры.
К чорту іх межы! К д'яблу граніцы..!
Нашы тут гоні, бары!

Будзем мы самі гаспадарамі,
Будзем свой скарб ратаваць!
Годзі тэй крыўды! Ў ногу з братамі
Пойдзем наш край вызваляць.


Ох, і агорклі гэтыя кпіны..!
Злучым мы ў хор голасы:
Эх, вы разлогі роднай краіны,
Нашы палеткі, лясы!

Родны вы сэрцу нашаму гмахі
Лесу, лугоў і палёў!
Досыць ўшчувалі нас паны-ляхі,
Ведаем ціск маскалёў...

Змоўкні жа, сьціхні, песьня пакуты!
Заварушыся, наш край!
Люд! Вызваляйся, рві свае путы,
Новыя песьні сьпявай!

Г. В. Ц. № 231. 1 Сав. друк. № 1614.

ЗЬМЕСТ.



Стр.



[illegible]руская Кооперацыйна - Выдавецк[illegible]
«АДРАДЖЭНЬНЕ»

[illegible] [illegible] выданьн[illegible] кніг на беларускай мове [illegible] усіх галін навукі й прыгожага пісьменства.

Т-ва «Адраджэньне» прыймае у склад [illegible] дзяржаўныя, грамадзянскія, кооперацыйныя установы й прыватных асоб.

[illegible] пай [illegible] 10 руб. [illegible].

Адрэс: Менск. Са[illegible]олеўская вуліца, № [illegible] (бакавы [illegible] дом).

Беларускае [illegible]перацыйна-Выдавецкае Т-ва
«Адраджэньне»

Надрукавана:

1. *Якуб Колас* — [illegible] (Сборнік вершаў [illegible]).
2. *Праф. [illegible]* — «[illegible] па [illegible] Беларусі [illegible]».

Друкуецца:

[illegible] *Янка Купала* — «[illegible]» [illegible].
[illegible] *Ф. Багушэвіч* — «[illegible]».
[illegible] *Валасевіч* [illegible] — [illegible] ч. I.
[illegible] — [illegible] ч. I.

Выстаўлены [illegible]:

1. *Зьмітрок Бядуля* . . . . «[illegible]».
[illegible] *Якуб Колас* . . . . [illegible] роднае мовы.
[illegible] *Крупскевіч* . . . . [illegible] ч. II.
[illegible] *Азбукін* . . . . Геаграфія Эўропы.
[illegible] *Трэякоўскі* . . . . . . [illegible] ч. I.
ч. II.
[illegible] — [illegible].

[illegible] Беларускага Кооперацыйна-Выдавецкага Т-ва
«Адраджэньне»

[illegible]